Літаратурная Беларусь

Выпуск №2 (102)
(люты)

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ ПРАЕКТ
Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага Часу»

lit-bel.org
novychas. info

Змест

Сінявокая ў Масковіі

СУЧАСНАЯ КАЗКА



Анатоль ВЯРЦІНСКІ

*Ці то ясным днём, ці то ў непагадзь,
ці то раніцай, ці то вечарам
ды дайшла-даехала, Сінявокая,
да ўладарства трыдзявятага,
трыдзясятага таго царства
са сталіцаю Белакаменнаю,
Золатаглаваю, Першапрастольнаю,
з гэтай самаю Масковіяй.
Пакланілася ёй нізка
і спыталася нясмела:
— Ты скажы мне, Масква-Масковія,
як вітаць мне цябе, якой моваю
мне пачаць размову з табою?
Сказаць ветліва: «Добры дзень!»
Сказаць: «Добры дзень у хату»?
Альбо, можа, неяк іначай?*


*Ухмыльнулася Белакаменная,
усміхнулася Золатаглавая,
засмяялася Першапрастольная
і адразу ж адказала:
— Ну й дзівачка ж ты, Сінявокая,
вочы сінія, наіўныя!
Задаеш мне такое пытанне.
Ты напраўду не знаеш, не ведаеш,
як са мною трэба вітацца
і якой гаварыць са мной моваю?
Ты хіба не знаеш, не ведаеш,
што найлепшая з усіх моваў —
гэта мова мая, маскоўская,
гэта мова мая, расійская.
Ты спытаеш, чаму найлепшая?
А таму, што магутная самая,
а таму, што самая гучная,
і ёй дадзена ўладарыць,
панаваць над іншымі мовамі.
І навошта тваё гэта смешнае
«добры дзень... добры дзень у хату...»,
калі ёсць маё «здравствуйте!.. здрасте!..»
Зразумела, Сінявокая?*

*Тая колькі хвілін маўчала,
бо сумелася ад нечаканасці.
А затым прамовіла ціха:
— Не, не ведала я... Я думала...
А я думала, Масковія...*

*Засмяялася Першапрастольная:
— Во цікава... Яна думала...
Што ж тут думаць, Сінявокая,
калі тут і думаць нечага,
калі ўсё і так зразумела!
Казаць трэба: «Здравствуйте!..
здрасте!..»*

*Адазвалася Сінявокая,
ціхім голасам сказала:
— Калі я да цябе ішла-ехала,
то была ў галаве адна думка,
і была гэта думка пра тое,
што, шаноўная Масковія,
мы не толькі суседкі блізкія,
а мы сёстры родныя, крэўныя,
ва ўсім роўныя мы з табою,
што мы любім адна другую,
і таму ты не будзеш смяяцца
з маёй мовы, з майго прывітання:
«Добры дзень... дзень добры ў хату!»*

*Засмяялася Першапрастольная,
усміхнулася Золатаглавая,
ухмыльнулася Белакаменная:
«Здрасте, здрасте, Сінявокая!
Значыць, вось ты пра што думала
сваёй буйнаю галоўкаю,
значыць, вось ты чаго захацела...
А ці знаеш ты, а ці ведаеш,
што хоць сёстры мы, ды няроўныя:
ты — малодшая, я — старэйшая,
ты — малая, а я — вялікая
і ва ўсім за цябе я большая.
Пра любоў ты нешта сказала?
Дык вось слухай, сястра-сястрыца,
Сінявочка дарагая.
Ёсць падставы ў мяне сумнявацца,
што напраўду мяне самую
бескарысліва ты любіш.*



*Не мяне ты любіш, здаецца,
а найперш — мае грошы-траншы,
а найбольш — мой газ, маю нафту.
Ці не ўся тут любоў-сімпатыя?
Ці не так, сястра-сястрыца,
мая лепшая хаўрусніца
і саюзніца мая першая?*

*Разгубілася Сінявокая.
Разгубілася, сумелася,
засмуцілася і заплакала.
Паліліся з вачэй яе сініх
слёзы светлыя, буйныя.
Адно толькі з плачам казала:
— А я думала... а я думала...*

*Ухмыльнулася Белакаменная,
усміхнулася Золатаглавая,
засмяялася Першапрастольная,
запыталася ў Сінявокай:
— Пачакай... Што з табой, дарагая?
Ты заплакала? Ты плачаш?
Але ж ты дарма гэта робіш,
але ж слёзы твае марныя.
Ты хіба не знаеш, не ведаеш,
што Масква слязам не верыць?
Так, не верыць слязам спрадвеку.
Ні буйным не верыць, ні дробным,
ні салёным і не горкім,
ні чужым і не сястрынскім.
Ты хіба не ведаеш гэта?*

*— Я ці ведаю?.. Ці знаю?..
Не, я думала... я думала... —
галасіла ў адказ Сінявокая,
выціраючы слёзы горкія.
Хутка-хуценька засабіралася
у зваротны шлях-дарогу,
да сваіх абсягаў-гоняў,
да сваіх азёраў сініх
і да рэкаў сваіх блакітных.
І якраз у гэты момант
зазванілі-забілі куранты,
тыя, што на крамлёўскай вежы,
нібы звонам сваім пацвярджалі
(так пачулася Сінявокай),
што не верыць слязам Белакаменная
і не верыць Золатаглавая,
што яе нехта шчыра любіць
(хіба можна любіць за нафту?).
І яшчэ ў тым звоне адметным
яўна чулася Сінявокай,
што яна, Першапрастольная,
прызнае адно толькі вітанне
на адной толькі, гэтай вось мове:
«Здравствуйте.. здрасте-здрасте...»*

*Тут і казцы канец, якую
я пісаў то пяром, то алоўкам
то ўранні, то познім вечарам
і назваў недарэмна сучаснаю,
бо яна сапраўды такая.*

Студзень 2015 г.



Кнігі ад «Prestigio»

Электронная бібліятэка ebooks. prestigioplaza.com запрашае ўсіх ахвотных наведаць свет беларускай кнігі. На рэсурсе знаходзяцца ў вольным доступе многія выданні на роднай мове.

Праект «Кнігі Prestigio» прадстаўлены чыталкай eReader Prestigio і сайтам ebooks.prestigioplaza.com/by/be.

Каманда Prestigio дапаможа не прапусціць самыя цікавыя навінкі сезона і будзе побач, калі вы пажадаеце абмеркаваць прачытанае.

Prestigio

Мэта праекта — пазнаёміць чытача з новымі беларускімі літаратарамі, асвяжыць у памяці старонкі кніг аўтараў мінулых гадоў.

На рэсурсе сабрана больш мільёна кніг 208 аўтараў, актыўна папаўняецца «залатая калекцыя» класічнай літаратуры, а таксама сучасныя кніжныя навінкі, якія можна спампаваць бясплатна.

Чытайце на роднай мове!

Новая кніга Віктара Казько

Гэта — «Час збіраць косці» (серыя «Кнігарня пісьменніка» Бібліятэкі Саюза беларускіх пісьменнікаў). У яе ўвайшлі тры аповесці, у якіх аўтар запрашае чытачоў у падарожжа пакручастымі сцежкамі чалавечае памяці.



Віктар Казько — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Якуба Коласа — адным з першых у сучаснай літаратуры паказаў вайну праз прызму ўспрыняцця дзіцяці. У апошнія дзесяцігоддзі шмат увагі надае экалагічнай праблематыцы, экзістэнцыйным пытанням, а таксама маральнаму і нацыянальнаму станаўленню беларускага грамадства.

Акрамя аповесці «Час збіраць косці», якая дала назву кнізе, у зборнік увайшлі творы «Прахожы», «І нікога, хто ўбачыць мой страх».

Шукайце новыя выданні ў кнігарнях вашага горада!

«Баваўняная дзяўчынка»

Серыя «Каляровы ровар» Бібліятэкі Саюза беларускіх пісьменнікаў папоўнілася новай дзіцячай кнігай.



«Баваўняная дзяўчынка», створаная пісьменніцай Дар'яй Вашкевіч і праілюстраваная мастачкай Аленай Медзяковай, пабачыла свет у выдавецтве «Галіяфы».

Гэтая казка «пра і для дзяўчатак і хлопчыкаў ад двух да ста дзевятнаццаці гадоў» заняла другое месца ў літаратурным конкурсе СБП «Экслібрыс» імя Янкі Маўра.

Ці сапраўды гісторыю пра баваўняную дзяўчынку можна чытаць «удзень і ўначы, нашча ці толькі што пад'еўшы, лежачы пад коўдрай або ўскараскаўшыся на яблыню», як жартаўліва рэкамендуе анатацыя? Пра гэта мы распыталі стваральніцаў кнігі.

Дар'я Вашкевіч: «Добрая дзіцячая кніга, на мой погляд, можа быць цікавая і для дзяцей, і для дарослых. З майго дзяцінства запомніліся «Хронікі Нарніі» і «Піпі ДоўгаяПанчоха» — мне іх чыталі бацькі, часцей тата, і гэта было захапляльна для нас усіх, не толькі для мяне. І нават сёння мы з бацькамі, абмяркоўваючы кнігі, прыходзім да высновы, што дарослых узбагачае чытанне кніг для дзяцей. Мая казка нарадзілася нечакана — цудоўнасць дзіцячай кнігі ў тым, што яна дае вялікую прастору для фантазіі. Мая гісторыя адвечная, як і ўвесь наш свет — пра любоў ва ўсіх яе праявах.

— Для мяне гэта першы досвед ілюстравання менавіта кнігі, дзіцячай кнігі, — прызналася Алена Медзякова. — Мова метафары для дзяцей — гэта рызыкоўна і адказна! З дзецьмі трэба размаўляць як з дарослымі, трэба дапамагчы ім зразумець і адчуць літаратурны сюжэт. Героі гэтай гісторыі — дзяўчынка, хлопчык і іншыя — валодаюць незвычайнымі якасцямі. Як гэта — баваўняная дзяўчынка? Якая яна? У выніку нарадзіўся такі «баваўняны» вобраз — дзяўчо з рудымі, надзвычай даўгімі, мяккімі валасамі і простым адкрытым тварам.

Пісьменнік стварае гісторыю, мастак падштурхоўвае чытацкую фантазію, а галоўная выснова — за маленькім чытачом, які ажыўляе і казку, і яе герояў.


Кнігі серыі «Кнігарня пісьменніка» можна знайсці ў мінскіх крамах «Цэнтральная кнігарня», «Акадэмкніга», «Веды», «Книги&книжечки», «ЛогвінаЎ», у інтэрнэце на prastora.by і knihi.by. Цікаўцеся!

Прэсавая служба СБП

САКАВІЦКІЯ ЮБІЛЯРЫ

У наступным месяцы адзначаюць юбілеі сябры Саюза беларускіх пісьменнікаў:

Іна Станіславаўна Снарская (нар. 07.03.1965)
Павел Валер'евіч Лоскутаў (нар. 11.03.1975)
Юрый Віктаравіч Пацюпа (нар. 13.03.1965)
Мікалай Сямёнавіч Маскевіч (нар. 22.03.1945)
Уладзімір Антонавіч Папковіч (нар. 25.03.1935)
Аляксей Уладзіміравіч Рагуля (нар. 25.03.1935)
Вера Аляксандраўна Буланда (нар. 26.03.1955)
Алесь Нарыманавіч Давыдаў (нар. 28.03.1965)
Аляксей Антонавіч Марачкін (нар. 30.03.1940)



Жадаем усім радасці, натхнення і дабрабыту!

«Вершы на асфальце»

З 13 па 15 лютага ў Мінску прайшоў IV Міжнародны паэтычны фестываль імя Міхася Стральцова, арганізаваны Саюзам беларускіх пісьменнікаў.



Атэна Фарухсад і Дзмітрый Плакс. Фота Алены Казловай



Журы-зала ацэньвае «слэмаўцаў»

Ён пачаўся 13 лютага ў галерэі «Ў» прэзентацыяй дэбютных кніг Тані Скарынкінай, Касі Сянкевіч, Юлі Цімафеевай і Антона Рудака.

Другі фестывальны дзень адкрыла «Вялікае Княства Паэзіі», у якім узялі ўдзел госці з Літвы, Украіны, прагучалі пераклады з польскай, літоўскай, ідыш. З прывітальным словам выступіў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Літоўскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Эвалдас Ігнатавічус.

Імпрэза распачалася невялічкім міжнародным флэшмобам: удзельнікі фэсту, беларускія і замежныя аўтары, па чарзе чыталі вершы і прозу Міхася Стральцова. Сюрпрызам сталі Стральцоўскія радкі, зачытаныя на шведскай мове Атэнай Фарухсад, на латышскай — Арвісам Вігулсам, на літоўскай — Гінтарасам Граяўскасам. Сяргій Жадан падчас свайго знаходжання ў Мінску пераклаў некалькі вершаў Стральцова на ўкраінскую мову.

Аўтары з краін-спадчынніц Вялікага Княства Літоўскага і шырэй — Рэчы Паспалітай — дзяліліся ў межах «Вялікага Княства Паэзіі» сваімі культурнымі здабыткамі, узаемнымі перакладамі. Шматмоўнасць — яго асноўная асаблівасць.

Вядоўца вечарыны Андрэй Хадановіч і Сяргій Жадан прадставілі пераклады фрагментаў паэмы Чэслава Мілаша «Дзеці Еўропы».

Літоўская паэтка Гедрэ Казлаўскайтэ выступіла супольна з перакладчыцай Марыйкай Мартысевіч. Аўтар з Клайпеды Гінтарас Граяўскас прадставіў сваю творчасць разам з Андрэем Хадановічам, які перастварыў яго па-беларуску.

Сольна выступілі ўкраінцы Ірына Баташчук, Сяргій Жадан, Дзмітро Лазуткін.

Беларускую праграму забяспечылі Адам Глобус, Наста Кудасава, Наталля Кучмель, Уладзь Лянкевіч.

Фестываль працягнуўся паэтычным слэмам «Беларусь — Украіна».

Каманднае выступленне дзвюх паэтычных зборных Беларусі супраць зборнай Украіны ў першым туры ў паўфіналеператварылася ў індывідуальнае. У якасці суддзяў на слэме выступілі гледачы.

Да 18 паэтаў-удзельнікаў слэму падчас вечарыны далучыліся яшчэ два творцы — паэтка Атэна Фарухсад са Швецыі і перакладчык яе вершаў на беларускую мову паэт Дзмітрый Плакс.

Прадбачыць зыход паэтычнага слэму досыць складана ці нават немагчыма. Цяжка меркаваць, што больш спадабаецца публіцы — «сур'ёзны» верш, прачытаны без асаблівага артыстызму, ці просценькі тэкст на блізкую многім тэму, прадстаўлены «з густам». Гэта як бы без правілаў: прымяюцца любыя метады ўздзеяння на публіку, спробы прывабіць увагу гледачоў і запомніцца.

Няважна, чым паэт плануе ўразіць (акцэнтаваць увагу на яркіх чырвоных туфлях на высокім абцасы, давесці амаль да істэрыкі былога суддзю-гледача гукавым вершам ці рэпам пад рытм We Will Rock You), важны вынік у выглядзе высокіх адзнак і прыхільнасці аўдыторыі.

Паводле правілаў слэму, кожны ўдзельнік меў на выступленне тры хвіліны. У першым туры прынялі ўдзел 18 паэтаў з Беларусі і Украіны.

У першым туры слэму беларускамоўныя тэксты прадставілі Дар'я Балькевіч, Ганна Комар, Міхась Бараноўскі, Вета Знорк, Антон Рудак, Анастасія Кацюргіна, расійскамоўныя — Ганна Коўшар, Таня Светашова, Уладзімір Глазаў, Ганна Мананкова, Яўген Бясчасны, Георгі Барташ.

Склад украінскай зборнай быў наступны: Алена Сцепаненка, Сяргей Прылуцкі, Дзмітро Лазуткін, Аляксандр Ткачынскі, Юры Мацевашчук, Юры Завадскі.

У выніку перамог Георгі Барташ. Думаецца, суддзяў і гледачоў уразілі яркасць падачы тэкстаў, а таксама элегантны шалік на яго шыі. Пераможца атрымаў смартфон «Prestigio», а ўсе паўфіналісты — прызы ад Саюза беларускіх пісьменнікаў і кампаніі «Будзьма беларусамі!».

15 лютага ў мінскай галерэі TUT.BY адбыўся завяршальны этап Фестывалю «Вершы на асфальце» імя Міхася Стральцова, які запомніўся шматгадзіннымі паэтычнымі чытаннямі на розных мовах, а таксама яскравым музычным джэмам.

З першай і да апошняй хвіліны праграмы, да глыбокага вечара, у зале было шмат цікаўнай публікі.

Марафон быў распачаты паэтам і перакладчыкам Дзмітрыем Плаксам (Беларусь-Швецыя), які выступіў у супольным музычным праекце-перформансе са знакамітым гуртом Drum Ecstasy.

У межах сёлетняга фэсту выступілі некалькі дзясяткаў паэтаў. Найбольш маштабныя чытанні адбыліся якраз у апошні праграмны дзень і былі ўмоўна падзеленыя на дзве часткі.

Калі выступленні ўкраінскіх паэтаў Дзмітрыя Лазуткіна і Юрыя Завадскага былі загадзя заяўленыя ў праграме, то з'яўленне нашага Уладзіміра Някляева стала для публікі прыемнай нечаканкай. Нарвежскі паэт Эрлінг Хітэлсэн і перакладчык Лявон Баршчэўскі ў межах фестывалю чыталі арыгіналы і пераклады. Берасцейскі «дэсант» быў прадстаўлены паэтамі Яўгенам Бясчасным, Уладзімірам Глазавым і Ярынай Дашынай. Дзмітрый Кузьмін (Латвія) і Жанар Секербаева (Казахстан) агучылі вершы на расійскай мове.

На закрыцці фестывалю гледачоў чакаў музычна-паэтычны кактэйль, а таксама выступы Касі Сянкевіч, Стася Карпава, Мікіты Найдзёнава, Сяргея Цімафеева, Арвіса Вігулса (Латвія), а таксама літоўскай паэткі Гедрэ Казлаўскайтэ, беларускай перакладчыцы Марыйкі Мартысевіч, Гінтараса Граяўскаса, Андрэя Хадановіча, Сабіны Брыло, Тані Светашовай, Тані Скарынкінай.

Завяршэннем Стральцоўскага фэсту стаў музычна-паэтычны джэм з удзелам калектываў Intelligency, TonqiXod, Triangle. Кожны з гуртоў падрыхтаваў сумесныя выступы з паэтамі Уладзімірам Лянкевічам, Таняй Скарынкінай, Дзмітрыем Строцавым, Вікай Трэнас, Андрэем Хадановічам (Беларусь), Сяргеем Цімафеевым (Латвія), Дзмітро Лазуткіным і Аленай Сцепаненка (Украіна), Сяргеем Прылуцкім (Беларусь-Украіна).

Паводле lit-bel.org

Шчодрыя дэдыкацыі

Да 80-годдзя Рыгора Барадуліна

Уладзімір СІЎЧЫКАЎ

Ашчадна захоўваю ў сваіх архівах некалькі дзясяткаў рукапісаў, аўтографаў і дарчых надпісаў Народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна...

Падчас свайго школьніцтва, навучання ў мастацкай вучэльні ды абітурыенцтва ведаў яго творчасць, што называецца, у межах праграмы. Студэнтам універсітэта стаў набываць ягоныя зборнікі, дэкламаваў верш «Філфакаўкам» на святочнай вечарыне.

А вось асабістае знаёмства адбылося ў Вязынцы — на традыцыйным студэнцкім святе паэзіі 1982 года, якое я вёў, што і засведчыў на сваім здымку, надрукаваным пазней у альманаху «Дзень паэзіі», фотамайстар А. Каляда. Запомнілася сустрэча і тым, што якраз перад маім чытаннем аўтарскіх вершаў пры помніку Янку Купалу гучна загрукацела коламі электрычка, а паэт падбадзёрыў, маўляў, смялей, — чытай, мы пачуем!

Пасля былі і вучоба ў мэтра на семінары маладых літаратараў у толькі што адбудаваным Доме творчасці «Іслач», і першы аўтограф на «Маўчанні перуна» («Дарагому Уладзіміру Сіўчыкаву — сваёй дарогі ў паэзіі і жыцці жадаю, верачы ў талент!»), і сустрэчы ў выдавецтве «Мастацкая літаратура», і выступы перад камерамі ў тэлестудыях, і літсустрэчы з чытачамі, і ўдзел у літаратурна-мастакоўскіх пленэрах у Бычках, на імпрэзах у Палацы мастацтва...

Пазней сталася так, што займеў правa і магчымасць пазваніць яму ва Ушачу, як іменаваў ён сваю малую радзіму, або завітаць дахаты на менскую вуліцу Івана Мележа, пагаманіць у паэтавым кабінеце, застаўленым кнігамі, а перадусім слоўнікамі. Называў класіка і творцу мовы дзядзькам Рыгорам, што яму было вельмі да душы. І страшэнна не любіў ён, калі звярталіся да яго «Уважаемый (Дорогой) Григорий Иванович!» — запрашэнні з такім зваротам нечытаныя ляцелі ў сметніцу.

Зразумела, можна паблажліва ўсміхнуцца, — маўляў, ці мала за сваё жыццё панапісваў класік віртуозных вершаваных прысвячэнняў?! Колькі іх хаця б у «радыёсвабодаўскай» кніжцы «Дуліна ад Барадуліна»?!

Але я «сваімі» барадулінскімі радкамі даражу.


Не змог паэт па стане здароўя прыйсці ў на той час яшчэ наш Дом літаратара на прэзентацыю анталагічнага выдання «Яна і Я. Вершы і песні пра каханне», затое перадаў створаны экспромтам проста на трамвайным прыпынку, напісаны чорным атрамантам свой чытацкі водгук. Настолькі няўрымслівы і нават рызыкоўны, што маршалак тае аншлагавай імпрэзы паэтаў цёзка і сусед, графік Рыгор Сітніца не насмеліўся агучыць яго са сцэны цалкам.

***

Няхай
Як у лірыка і выдаўца
Ва Ўладзімера Сіўчыкава заўсёды
Хапае эмоцый
І моцы канца,
Зь якога пачатак
Бяруць народы!

Дзядзька Рыгор
13.X.05

P.S.
Жадаю ў мроях
Крыляць сакалом,
Шляхетна трымацца,
Элітніцца.
Нястомна і ў ложку
І за сталом
Завіхацца зь нягнуткім калом,
Як Сітніца!



Дзядзька Рыгор. Фота Уладзіміра Сіўчыкава

Кніжка, на якую так адгукнуўся мэтр, пачыналася своеасаблівай інтрадукцыяй — «Найвышэйшай песняй Саламонавай» у барадулінскім узнаўленні. Зборнік той распачаў даволі грунтоўную паэтычную серыю прыватнага выдавецтва «Радыёла-плюс», якое ачольваю ўжо дваццаць гадоў. Быў і застаюся вельмі ўдзячны дзядзьку Рыгору, што пагадзіўся напісаць прадмовы да тома выбраных твораў Максіма Багдановіча «Інтымны дзённік», а таксама да паэтычнай анталогіі «Крэмень і крэсіва», якая днямі, спадзяюся, патрапіць нарэшце на друкарскі варштат.

Ну а працаваць з паэтам над кнігаю з фантастычнай алітэрацыяй на супервокладцы «Рыгор Барадулін. Руны Перуновы. Выбраныя творы», укладаць яе разам з Алесем Камоцкім, замаўляць уступнае слова Уладзіміру Някляеву ўвогуле было за насалоду! Асабліва калі згадаць, што ўсе тамы серыі аздабляў сваімі творамі мэтр не толькі беларускае, але і ўсяе еўрапейскае графікі Арлен Кашкурэвіч, майстэрства якога дзядзька Рыгор шанаваў вельмі высока. Напэўна, хтосьці і не пагодзіцца, але «Руны Перуновы» — адна з самых прыгожых сярод сямі дзясяткаў барадулінскіх кніг. Можа, яшчэ і таму, што змешчаны ў ёй 24 партрэты паэта знаных фотамайстроў, а над дызайнам шчыраваў спрактыкаваны Міхаіл Драко.

На важкім барадулінскім зборніку «Ксты», які выйшаў незадоўга перад «Рунамі Перуновымі», бывае, перачытваю такі подпіс:

Знадзеена курсіў чакаў
Падкрэсьліць
Важную праяву,
Што не спазьніўся
Ўпарты Сіўчыкаў
Скарынаўскую
Доўжыць справу!

Дзядзька Рыгор
17.X.05
Менск

І гэтую дэдыкацыю ўспрымаў і ўспрымаю як пэўны аванс, які яшчэ доўга давядзецца адпрацоўваць. У пэўнай ступені ўдалося гэта, калі падгаварыў дзядзьку Рыгора забраць і перадаць нам машынапіс кніжкі дзецям з, ізноў жа, «рыклівай» назвай «Выпаў грук у грома з рук», якi па зразумелых прычынах залежаўся быў у дзяржвыдавецтве.

У папцы быў вузкі аркуш з эпісталай:

Вяльможны спадар
Уладзімер!
Дзякуй за ласку і ўвагу!
Вы робіце справу, якая застанецца ў вяках. Робіце тое, што рабіць бы
мусіла нармальная дзяржава.
Нашай не да культуры, не да клопату
пра мову, пра мазгі нацыі. Але Бог зь ёй. Быў бы толькі здаровы Уладзімер
Сіўчыкаў і ўсё будзе.
Яшчэ раз — дзякуй і нізкі паклон!

Дзядзька Рыгор.
15.V.07

Перадаю Вам друкапіс дзіцячай кніжкі.
Зь Яна Бжэхвы вершы выбірайце самі
— веру ў ваш густ.

Цалкам пагаджаюся з класікам — на вялікі жаль, і сёння многае ў беларускай культуры, літаратуры і мастацтве робіцца не дзякуючы, а насуперак дзяржаве, яе культурнай, а дакладней, антыкультурніцкай палітыцы. Робіцца намаганнямі энтузіястаў, падзвіжнікаў і сапраўдных патрыётаў, насуперак «спрыянню» чыноўнікаў.

«Як на добры лад, — казаў дзядзька Рыгор, — дык дзяржава мусіла б даць палёгку ўсім выдаўцам беларускамоўнай, а тым болей — беларускамоўнай дзіцячай літаратуры, як тое калісь і было. Сёння ж гэта — з галіны фантастыкі!»

Папрасілі былі дапоўніць, асвяжыць друкапіс, як называў дзядзька Рыгор свае машынапісы з рукапіснымі праўкамі, зборніка «Выпаў грук...» некалькімі вершамі пра сучасныя рэаліі ды гаджэты. Без аніякай фанабэрыі ці сумненняў пагадзіўся ён, а літаральна праз пару тыдняў перадаў тэксты — пра ролікавыя канькі, пра электронную пошту, пра кампутар і інтэрнэт, пажартоўна далажыў, працытаваўшы радок з Максіма Танка: «Выканана партыі заданне!», і дадаў: «Не ведаю, як атрымалася, але стараўся. Дзякуй шчыры за клопаты, за ўвагу! Чалом!»

Ахвотна даваў ён дазвол друкаваць вершы ў «Крынічцы. Хрэстаматыі для дзяцей малодшага школьнага ўзросту», падказаў назву і на замову бліскуча пераклаў сем вершаў у кніжку «Качка-дзівачка. Польская паэзія дзецям: выбраныя старонкі з паэтаў XIX–пачатку XXI стагоддзяў».

Меў я за гонар і за радасць пабачыць свой выдавецкі лагатып і ягоныя дарчыя надпісы і на такіх выданнях, як камплект кніжкі з дыскам «Вяровіца», а таксама на кніжачцы хуткамовак «Воз вёз лёс».

Свае адносіны з дзядзькам Рыгорам у апошняе дзесяцігоддзе назваў бы творча-вытворчымі, але, натуральна, усплываюць і чыста пабытовыя цёплыя згадкі.

Набраў быў аднаго разу дамафон у ягоным пад'ездзе і пачуў нечаканае: «Ужо спускаюся!» Літаральна праз колькі мінут, і праўда, паказаўся ў дзвярах разам з жоначкаю Валянцінай ды з валізкамі, з палёгкаю выдыхнуў: «Вас сам Бог паслаў!» Аказалася, што акурат гэтым часам трэба было яму чарговы раз класціся ў лечкамісію абследавацца ды папраўляць здароўе, а я быў якраз на машыне.

І чамусьці прыгадваецца эпізод, як быў ён у нашым офісе пры вуліцы Петруся Броўкі, а мая жонка запрасіла пакаштаваць яе ткемалі з лавашом. Без капрызаў, а хутчэй з цікаўнасцю прайшоў ён на кухню, паслухмяна частаваўся з піялы грузінскім соўсам са сліў...

Узяў на сябе адказнасць, склаў яшчэ адзін барадулінскі, пазвонны том вершаў і эсэ «Тастамéнт. Выбраныя творы», што прымусіла перагартаць, перачытаць і «Маладзік над стэпам», і «Здубавецьця», і «Босую зорку», і «Евангелле ад Мамы», і «Лісты з Хельсінкі»...

Чакае і, дасць Бог, прычакае свайго часу і рудаватая тэчка, падпісаная знаёмым почыркам, — друкапіс перакладаў з Восіпа Мандэльштама з радкамі просьбы-запавету: «...Буду ўдзячны, калі Вас зацікавіць магчымасць выдання двухмоўкі».



Рыгор Барадулін, Вікторыя Ляшук, Генадзь Бураўкін, Уладзімір Сіўчыкаў. Вязынка. Вясна 1982. Фота А. Каляды

Уладзімер Арлоў падрыхтаваў да друку трэцяе выданне сваёй вядомай кнігі «Імёны Свабоды», якая ўпершыню пабачыла свет у 2007 годзе ў «Бібліятэцы Свабоды XXI стагоддзя». Цяпер чытача чакае сустрэча з 300 партрэтамі тых, хто ад часоў Тадэвуша Касцюшкі і да нашых дзён змагаўся за свабоду і незалежнасць у самых розных іх вымярэннях і ўвасабленнях. Прапануем увазе чытачоў «ЛБ» некалькі новых старонак гэтай кнігі памяці і пашаны.

«Аддавайся жыццю светланосна!..»: Ніна Мацяш

Мой нататнік з тэлефонамі ды адрасамі сяброў і знаёмых пачынаецца з эпіграфу — верша Ніны Мацяш:

Не знадзейвайся. Перажыві.
Хоць якая, ды ёсць патоля:
Намарозіць радня па крыві...
Адагрэе радня па долі.

Сэрца — зашмаргай... Перарві
Ёсць лагода на боль, на скруху:
Адрачэцца радня па крыві –
Паратуе радня па духу.

Праўду гэту — як ёсць — прыві
Да сцяжыны далейшага руху.
Будзь здарова, радня па крыві.
Будзь бяссмертна, радня па духу!



У дзяцінстве Ніна была, на першы погляд, звычайнай дзяўчынкай. Ну, можа, крыху больш засяроджанай, чым раўналеткі. Заглыбленай у сябе. Відаць, душа ўжо прадчувала хваробу, што таілася ў генах.

Сямнаццацігадовая вясковая дзяўчына перажыла сапраўднае шчасце, даведаўшыся, што залічаная на «французскі» факультэт Мінскага інстытута замежных моваў. Але зусім хутка, яшчэ на першым курсе, грымнула бяда... У інстытут Ніна вярнулася толькі праз чатыры гады, за шэсць семестраў здаўшы экзамены й залікі экстэрнам. Атрымаўшы дыплом, выдатна ведала французскую й нямецкую. Ангельскую й польскую вывучыла самастойна.

Невылечная хвароба на ўсё астатняе жыццё прыкула Ніну да інваліднага вазка. Але яна не зламалася, не пусціла ў душу ні роспачы, ні злосці, ні панявернасці. Успрыняла гэты выклік лёсу нават не як свой крыж, а як адзначанасць, абранасць Богам.

Ніна Мацяш здзейснілася як асоба і зрабіла гэта ў некалькіх сваіх іпастасях-увасабленнях.

Яна ўзнялася ў шэраг нашых выдатных паэтак, атрымаўшы высокія літаратурныя ўзнагароды і галоўную з іх — чытацкую любоў.

Яна зрабілася прызнанай перакладчыцай, пераўвасобіўшы па-беларуску паэзію нобелеўскай лаўрэаткі Віславы Шымборскай, «Маленькага прынца» Антуана дэ Сэнт-Экзюперы, паэтаў французскай «Плеяды», творы сучасных нямецкіх, бельгійскіх, украінскіх пісьменнікаў. За пераклады нашых паўднёвых суседзяў Ніна была ўганаравана міжнароднай прэміяй імя Рыгора Скаварады.

Яна таленавіта пісала для малых чытачоў — п'есы і казкі. Адна з іх — «Казка пра суседзяў, змяю і мядзведзя» — натхніла маладога Уладзімера Савіча, сёння прызнанага мэтра нашай графікі, на ілюстрацыі, якія мастацтвазнаўцы лічаць класікай кніжнага афармлення.

Яна з дзяцінства марыла падарожнічаць, каб пабачыць свет. І, хоць камусьці гэта можа здавацца парадаксальным (у нас нават у Менску інвалід у вазку не заўсёды знойдзе патрэбны пандус, не кажучы ўжо пра ліфты), здзейснілася і ў іпастасі вандроўніцы. Памятаю, як свяціліся яе вочы, калі мы прыехалі на літаратурныя чытанні ў Нямеччыну і Ніна, прыслухаўшыся да мовы на вуліцах, адчула, што ўсё разумее, а назаўтра загаварыла з гаспадарамі сама. Тое ж здарылася і ў Парыжы, куды з свайго дома ў нямецкай Гоце прывёз улюбёную паэтку ейны даўні сябар-беларус Зміцер Ярашэўскі.

Ніну Мацяш называюць грамадскай дзяячкай. Я не згодны. Яна дасягнула невымерна большага — зрабілася бясспрэчным маральным аўтарытэтам краіны. Пры ўсёй розніцы лёсаў я паставіў бы яе ў адзін шэраг з Ларысай Геніюш. Да спадарыні Ларысы мы ездзілі па духоўную падтрымку ў 1970-я. Да Ніны знаёмыя і зусім незнаёмыя людзі ехалі ў наш час... Я асабіста ведаю дзясяткі людзей, якія сталі беларусамі дзякуючы Ніне. А іх былі сотні, а мо і тысячы.

Ці трэба казаць, як Ніна Мацяш ставілася да цяперашняй улады? Афіцыйныя сымбалі, зацверджаныя пасля рэфэрэндуму 1995 года, Ніна публічна называла «сымболікай часовага ўраду». Калі недзе «наверсе» яе выкраслілі са спісаў кандыдатаў на Дзяржаўную прэмію, я адразу падумаў, што Ніна ўсё роўна адмовілася б прыняць узнагароду ад рэжыму, які пагарджае нацыянальнымі каштоўнасцямі і найперш самай святой з іх — мовай.

Але яна не замыкалася ў коле аднадумцаў. Калі гэта не датычылася яе асабіста, Ніна, адстойваючы праўду і здаровы сэнс, грукалася і ва ўладныя кабінеты. Абласная берасцейская вертыкаль у свой час заснавала літаратурную прэмію імя Уладзіміра Калесніка, але — толькі для сяброў чаргінцоўскага пісьменніцкага саюза. У выніку рэзкага, але бліскуча абгрунтаванага звароту Ніны Мацяш (на той час калегі-мужчыны пераклалі на яе моцныя плечы кіраўніцтва абласной арганізацыяй Саюза беларускіх пісьменнікаў), адрасаванага галоўнаму абласному вертыкальшчыку, прыватызаваць імя вядомага літаратара і педагога не ўдалося. Літаратары-берасцейцы атрымліваюць цяпер гэтую ўзнагароду незалежна ад сваёй «партыйнай» прыналежнасці.

Прэмія імя Уладзіміра Калесніка, вельмі дарагога ёй чалавека, была прысуджаная і самой Ніне Мацяш. Пасмяротна.

Яна ўжо не паспела пакарміць мяне сваёй неверагодна смачнай гарбузовай кашай, як абяцала падчас апошняй сустрэчы.

Калі скончылася дзяцінства, я рэдка плакаў, але пачуўшы горкую навіну пра Нінін сыход, не здолеў стрымаць слёз.

Наша мудрая пісьменніца і крытык Альбіна Сямёнава ў тыя дні назвала Мацяш чалавекам еўрапейскага кшталту, асобаю з ліку абранніцаў Божых, якія жывуць у рытме гэтага абранніцтва. Сапраўды, за два дні да адыходу Ніна яшчэ выступала перад чытачамі.

Тады згадваліся й словы Янкі Брыля, які аднойчы, гаворачы пра беларускіх паэтак — Наталлю Арсенневу, Ларысу Геніюш і Ніну Мацяш — на першае месца паставіў менавіта Ніну.

Паўнюткую залу палаца культуры збіраюць у Белаазёрску прысвечаныя Ніне Мацяш літаратурныя чытанні, якія ладзяць ейныя паплечніцы й сяброўкі настаўніца Галіна Скарына, выкладчыцы Берасцейскага ўніверсітэта Святлана Воронік і Марыя Новік, дырэктарка гарадской бібліятэкі Тамара Кузняцова. Бібліятэка, дарэчы, ужо названая імем паэткі. Калі-небудзь тое ж здарыцца і з вуліцай, на якой яна жыла.

Пасля маёй аперацыі на сэрцы Ніна адной з першых дацягнулася слабенькай рукой да тэлефона, каб пазваніць мне ў рэанімацыю. Ёй ужо не дазвонішся, але яе голас працягвае гучаць у нашым беларускім космасе.

Звініць яе радок-запавет: «Аддавайся жыццю светланосна!»

«Ненармальны» з пяром і нажніцамі: Вячаслаў Дубінка

Аднойчы на пачатку 1980-х, прыехаўшы на студэнцкія вакацыі ў наш з ім родны Полацак, юны паэт і сябра знакамітай Беларускай майстроўні Сяргей Сокалаў (яшчэ не Воюш) падараваў мне толькі што выдадзеную кніжку пад назваю, ад якой адразу дыхнула нечым свежым і прытульным — «Не плач, душа мая». «Пачытай! — сказаў Сяргей. — Калі гэта — сацрэалізм, дык я — Байран».



Аповесць, на якую мне хапіла вечара з акрайцам ночы, падаравала глыток вольнага паветра. Галоўны герой Анцюха быў персанажам, безумоўна, станоўчым, але, відавочна, не савецкім. Ягоны вандроўны, «цыганскі» лад жыцця, нязводны гумар, авантурнасць нагадвалі асобаў, што дзейнічалі на старонках твораў Марка Твэна і О. Генры. Імя аўтара кнігі таксама спадабалася й надзейна легла ў памяць — Вячаслаў Дубінка. Я вырашыў, што пры нагодзе трэба абавязкова пазнаёміцца.

Нагода з'явілася, калі я пераехаў у Менск. Пасля выступу на векапомных Дзядах 1988 года ў мяне ўзніклі непаразуменні з міліцыяй, тым больш, што ў сталіцы, як было запісана ў пратаколе, я насамрэч пражываў без прапіскі. Пакуль Святлана Алексіевіч спрабавала прапісаць сумнеўнага элемента на сваіх метрах, я — каб не быць (у лепшым разе) прымусова вернутым на месца прапіскі — па чарзе жыў у сяброў. Акурат тады і адбылося нашае знаёмства з Вячаславам Дубінкам, які сам прапанаваў, колькі спатрэбіцца, жыць у яго ў майстэрні.

Народжанаму ў вальналюбным Слуцку хлапчуку з юных гадоў праглася рассунуць межы ўласнага свету як мага шырэй. У сёмым класе ён абтрос у суседа яблыньку, атрымаў на сокавыціскальным заводзіку чырвонец, купіў білет на цягнік, дакуль хапіла грошай, а далей на даху вагона даехаў да Адэсы — каб убачыць мора, пераначаваць на беразе і гэткім самым чынам ірвануць назад — насустрач матуліным кухталям. Пазней ён аб'ездзе ўвесь Савецкі Саюз, дабраўшыся да Магадана і Берынгавых астравоў, а — як толькі гэта станецца магчымым — пачне адкрываць іншыя краіны і асабліва палюбіць Грэцыю.

Аднак на ўсё жыццё галоўнай любоўю ў бясконцых падарожжах застанецца Беларусь, што найлепш пацвярджае безліч цудоўных здымкаў, зробленых Дубінкам у тыя гады, калі ён працаваў фотакарэспандэнтам у «Звяздзе» і «Чырвонай змене», а потым — фатографам у Рэспубліканскіх рэстаўрацыйных майстэрнях міністэрства культуры.

Колішні заўсёднік сустрэчаў у нонканфармісцкім інтэлігенцкім асяродку «На Паддашку», Вячаслаў Дубінка быў і застанецца ўнікальным для Беларусі творцам, надзеленым самымі рознымі талентамі і магутным жыццёвым аптымізмам. За тое, каб выдаць Дубінку пасведчанне сябра сваёй суполкі, галасавалі прыёмныя камісіі чатырох творчых саюзаў: журналістаў, пісьменнікаў, мастакоў і народных майстроў.

Ягоныя публіцыстычныя артыкулы і вандроўныя нарысы, што часам прыводзяць на памяць творы славутага паляка Рышарда Капусцінскага, пазнаваліся з некалькіх словаў. Дубінкавы прасякнутыя незнішчальнай ірoніяй і адметныя сакавітай слуцкай гаворкаю кнігі «Браты святой ночы» і «Сіндыкат Мані Дулі», як і «Не плач, душа мая», маглі б стаць літаратурным грунтам для авантурных кінасерыялаў.

Але найбольшую славу прынесла Дубінку старадаўняе беларускае мастацтва выцінанкі. Менавіта ён вярнуў выцінанку з нябыту і стварыў цэлую сучасную школу.

Улюбёнымі справамі Дубінка мог займацца дзе заўгодна. Падчас падарожжаў міліцыя колькі разоў затрымлівала «ненармальнага» з нажніцамі і паперай на вакзалах і ў аэрапортах. А пісаць, ізноў прыцягваючы ўвагу пільных ахоўнікаў парадку, ён найбольш любіў — уявіце сабе — на менскім паштамце.

Вячаслаў мысліў у агульнанацыянальных катэгорыях, але на жыццё заўсёды ўмеў глядзець і здзіўленымі вачыма дзіцяці. У апошнім інтэрв'ю ён сказаў, што жыве, кожны дзень чакаючы дзіва.

Ягонае сэрца спынілася ў жудасную спякоту 2010 года — на паўдарозе, на паўслове, на паўсправе. Рыхтаваў да друку дзве кнігі прозы і альбом выцінанак. Марыў пра выставу ў Швецыі. Шукаў новыя дакументы пра «другое слуцкае паўстанне», што выбухнула ў 1967-м супраць няправеднага савецкага суда. Дапамагаў Нілу Гілевічу ў выпуску чарговага тома надзвычай замарожанага «Мастацкай літаратурай» збору твораў. Здаў у турфірму дакументы на паездку ў Грэцыю...

Побач з урнаю, дзе змясцілася тое, што было целам Славы, жонка Тацяна паклала на пахаванні ягоныя акуляры й асадку са сталёвым пяром — якраз такімі ён і любіў пісаць.

Заходзячы на паштамт, я дагэтуль чакаю дзіва: а раптам у чалавечым тлуме сустрэну ўважлівы цёплы позірк ягоных неверагодна жывых вачэй?..

Уладзімер Арлоў

Эцюд пра Івана Лагвіновіча і яго родных

Дзяды і бацькі паэта

…Можна было б напісаць пра тое, як пару год таму я прыйшоў у дом малітвы малкавіцкай царквы евангельскіх хрысціян баптыстаў, як доўга стаяў у памяшканні, якое нагадвае праваслаўны прыдзел, і чакаў, калі скончыцца служэнне і я змагу ўбачыць Аляксея Піліпавіча Лагвіновіча.

Аляксей Піліпавіч, у адрозненне ад свайго брата Андрэя, аказаўся чалавекам іншай натуры. Андрэй Піліпавіч, калі я прыйшоў да яго ў двор і папрасіў пагаманіць са мною пра ягонага брата-паэта, спаслаўся на неадкладныя справы, зайшоў у дом, вынес адтуль нумар «Савецкага Палесся» ад 2 красавіка 2011 года і сказаў: тут пра яго ўсё.

Каб жа ў «Савецкім Палессі» было ўсё пра Івана Лагвіновіча! Напрыклад, нічога там няма аб радаводзе паэта.

Мы ішлі з Аляксеем Піліпавічам з малітоўнага дома па галоўнай малкавіцкай вуліцы. Ён мне апавядаў, а я на хаду запісваў.

Гісторыкам-краязнаўцам яшчэ трэба будзе ўдакладніць, калі канкрэтна ў Малкавічах была пошасць і нямала людзей памерла. У Нацыянальным гістарычным архіве захоўваюцца кнігі малкавіцкай царквы яшчэ з часоў Уніі. Можа, там ёсць запісы? Пэўна, пошасць была за паншчынай, за прыгонам. На месца памерлых у Малкавічы, якія належалі Патоцкім, прыехалі іншыя людзі. Ва ўсякім разе Аляксею Піліпавічу было вядома, што ў сяле было 42 надзелы зямлі для мясцовых і 17 — для прыезджых. Шкадую, я не запісаў, ці былі Лагвіновічы карэннымі малкаўцамі, ці прыезджымі. І тут зноў даследчыку могуць дапамагчы царкоўныя кнігі.

Паэтаў дзед, Мікалай, быў сірата і працаваў у малкавіцкага каваля Хілютыча (цяпер часцей пішуць гэтае прозвішча як Хілюціч). Калі Мікалай Лагвіновіч пасталеў ды ажаніўся, пан даў яму асобны надзел. З першаю жонкаю было ў Мікалая трое дзяцей: сыны Кірыла і Даніла, а таксама дачка (яе імя Аляксей Піліпавіч не помніў). Другі раз Мікалай Лагвіновіч ажаніўся з люсінкай Таццянай. Таццяна нарадзіла Мікалаю Лагвіновічу двух сыноў — Андрэя і Піліпа, бацьку нашага паэта. Нарадзіўся Піліп у 1891 годзе. Калі яму было 12 ці 14 гадоў, бацька ягоны памёр. Большы брат, Андрэй, ажаніўся і ўзяў меншага да сябе.

…Ідзем мы па галоўнай малкавіцкай вуліцы (назву яе не памятаю — нейкая кандова савецкая), і Аляксей Піліпавіч кажа: вось тут быў пляц Мікалая Лагвіновіча (для цікаўных: там, дзе стаіць дом 112), а вось тут — пляц каваля Хілютыча (дом 149). А яшчэ раней Аляксей Піліпавіч паказаў мне, дзе быў пляц Клішэўскага (жонка Піліпа Мікалаевіча Лагвіновіча — Тэкля Міхайлаўна — была з Клішэўскіх).


Піліпа і Тэклю вянчалі ў малкавіцкай царкве пасля таго, як ён адслужыў у царскім войску (дарэчы, у Вільні) і быў звольнены ў запас. (Думаю: а раптам у царкоўных кнігах захаваўся запіс пра гэтае вянчанне?)

Пажыць доўга цывільным жыццём царскаму салдату Піліпу Лагвіновічу не ўдалося. Неўзабаве тры імператары развязалі Вялікую еўрапейскую вайну, якую пазней сталі называць Першай сусветнай, а ў нашай старане людзі доўга называлі Мікалаеўскай (у «гонар» цара Мікалая ІІ). Да вайны ў Піліпа і Тэклі нарадзілася дачка. Яшчэ адну дачку Тэкля нарадзіла ў час вайны. Абедзве дзяўчынкі памерлі.

Піліп Лагвіновіч як салдат навучаны адразу трапіў на фронт. Ваяваў у Прусіі. Як там разгорталіся ваенныя падзеі, пра тое чытайце ў «Августе Четырнадцатого» Аляксандра Салжаніцына. У чыёй арміі — генерала Паўля-Георга Рэнэнкампфа ці генерала Аляксандра Самсонава — ваяваў наш зямляк, невядома. Аляксей Піліпавіч, апавядаючы пра бацьку, адзначыў, што служыў ён пры сцягу палка. Якога палка — пакуль што невядома. Затое вядома, што Піліп Лагвіновіч трапіў у палон да немцаў.

З лагера для ваеннапалонных практычныя немцы адправілі яго да галандскай мяжы — на завод Крупа. Мо яшчэ высветліцца, дзе канкрэтна быў той завод, на якім наш зямляк і яго таварышы пракатвалі рэйкі і рабілі дрот (пэўна ж, калючы, для фронту). Там, на заводзе, трое палонных ці не ў 1915-м згаварыліся ўцячы з палону. Дамовіліся — зрабілі. З нейтральных Нідэрландаў царскія салдаты перабраліся ў Нарвегію, з нейтральнай Нарвегіі — у саюзную Брытанію, а з Брытаніі — у, зноў-такі, нейтральную Швецыю. Са Швецыі Піліп Лагвіновіч трапіў у Фінляндыю, якая належала тады Расіі, а з Суомі дарога прывяла яго ў Петраград. Як і належала тады па закону, Піліпа Лагвіновіча ўзнагародзілі за ўцёкі з палону медалём. Ніякага табе фільтрацыйнага лагера, ніякага СМЕРШа. Такія вось былі парадкі ў той час — не тое, што пры «народнай» савецкай уладзе. Мала таго, былога палоннага Лагвіновіча з належнымі паперамі адправілі з Петраграда не ў штрафбат і не ў Сібір, а на Каўказ — у водпуск, папраўляць здароўе.

На Каўказе Піліпа заспела Вялікая рэвалюцыя, якую бальшавікі пазней перайменавалі ў Лютаўскую. А да кастрычніцкага дзяржаўнага пераварота, які бальшавікі пазней перайменавалі не проста ў рэвалюцыю, а ў вялікую ды яшчэ сацыялістычную, Піліп Лагвіновіч быў ужо ў родных Малкавічах, у абдымках сваёй Тэклі.



Іван Піліпавіч Лагвіновіч

Браты і сёстры

Ідзем мы па малкавіцкай вуліцы, і Аляксей Піліпавіч апавядае пра тое, як у 1922 годзе ў іх сяло прыйшлі «благавеснікі» — баптысцкія прапаведнікі — з Задуб'я: Піліп Амерыканец ды іншыя. Я маўчу, не кажу, што Піліп — родны брат маёй прабабы, што Амерыканец — яго мянушка, а сапраўднае прозвішча — Сідарэвіч. Мне важна больш уведаць пра сям'ю Івана Лагвіновіча, пра радавод паэта.

Аляксей Піліпавіч нічога не расказаў мне пра тое, як жылося-вялося яго бацькам у час вайны за Беларусь, калі то ўсталяваліся самыя першыя саветы, то прыйшлі немцы, затым зноў саветы, пасля палякі, яшчэ раз саветы і нарэшце — на 19 год — зноў палякі. На другі год савецка-польскай вайны за Беларусь — у 1920 годзе — нарадзілася ў Піліпа і Тэклі Лагвіновічаў дачка Ганна, у 1924-м з'явіўся на свет ён, Аляксей, а за ім яшчэ два хлопцы — Карней (1928) і Аўрам (1930). Пасля іх прыйшлі на свет Паўліна (1933), чыё імя мы сустрэнем у вершах паэта, і Андрэй (1936).

Пасля нараджэння Андрэя, у 1937 годзе, сям'я Лагвіновічаў перабралася з Малкавіч ва ўрочышча Запрапасць. На хутар Лагвіновічы выбраліся без камасацыі — звядзення сялянскіх земляў у суцэльныя участкі (хутары ці водрубы). Паводле закона Польскай Рэспублікі, ліквідацыя церапаласіцы праводзілася адначасова з парцэляцыяй — драбненнем панскіх уладанняў. У пана павінна было заставацца не больш як 180 гектараў зямлі. Рэшту ён мусіў распарцэляваць ці сам, ці пры дапамозе дзяржавы. Ведама, тыя парцэлы (дробныя участкі) прадавалі сялянам за грошы, часта ў доўг. Камасацыю ў Малкавічах польскія ўлады мераліся правесці ў 1940-м ці ў 1941-м.

Шкадую, не спытаўся ў Аляксея Піліпавіча, чые ляды былі ў Запрапасці — панскія ці дзяржаўныя. Затое ўспомніў, што слова «ляда» частавата сустракаецца ў творах паэта, і нават адзін зборнік яго вершаў мае загаловак «Ляда юдолі». Не спытаў у Аляксея Піліпавіча, адрасу яго бацька выкупіў тыя ляды ці плаціў за іх ра́тамі (па-цяперашняму — часткамі).

Карчавалі Лагвіновічы ніўкі не адно ў Запрапасці — у Грушэцкім і іншых блізкіх урочышчах. Слухаў Аляксея Піліпавіча і думаў, колькі такіх ніўак было ўроблена, акультурана нашымі дзядамі-прадзедамі і колькі іх змарнавалі бальшавікі. У ваколіцах Малкавіч, Задуб'і, Яловай я мог бы наладзіць вялікую экскурсію па закінутых і зарослых дзікім лесам хутарах. Спадзяюся, нехта з краязнаўцаў яшчэ напіша пра гэтае варварства.

Да біяграфіі паэта

На хутары ў Запрапасці і нарадзіўся Іван Лагвіновіч (15 студзеня 1940 г.). Гэта было ўжо за саветамі.

Цяпер нараджэнне дзіцяці дастаткова было зарэгістраваць у сельсавеце. І Іванавы бацькі не палічылі патрэбным, каб іх самага малодшага хрысцілі ў праваслаўнай царкве.

Забыў тут адзначыць, што праца прапаведнікаў новай веры дала свой вынік на пачатку 1930-х. Аляксей Піліпавіч казаў мне, што баптысцкая царква была заснавана ў Малкавічах у 1933-м ці то ў 1934 годзе. Піліп Лагвіновіч ахрысціўся паводле баптысцкага абраду ў 1935-м. Зноў жа: магчыма, нехта некалі напіша гісторыю гэтай царквы. А наш паэт, Іван Лагвіновіч, у чыіх творах вельмі моцныя хрысціянскія матывы, жыў няхрышчаны да вельмі салідняга ўзросту. Яго марай была беларуская царква. У адным з вершаў ён прасіў:

…калі я пamру,
над маёю магілай
БЕЛАРУСКІЯ песні спявайце.

На жаль, ні ў маім Задуб'і, ні ў Малкавічах беларускай царквы не было і няма. Беларуская царква знайшлася ў Баранавічах, дзе Іван Лагвіновіч жыў свае апошнія без малога 19 гадоў. Таемства хросту паэту ўдзяліў грэка-каталіцкі святар айцец Яўген Маліноўскі. Ён жа і адпяваў свайго парафіяніна на Красуні ў Малкавічах.

(Не магу не ўтрымацца, каб не адзначыць пару фактаў. Айцец Яўген Маліноўскі — не толькі святар; ён яшчэ і кандыдат псіхалагічных навук. Дык вось, гэтаму кваліфікаванаму спецыялісту не знайшлося працы ў Баранавіцкім універсітэце, выкладае ён у Мінску.)

Аляксей Піліпавіч Лагвіновіч расказаў мне шмат цікавага пра жыццё-быццё ў Запрапасці падчас апошняй вайны, калі яго самы малодшы брат, Іван, падрастаў і пачаў задаваць пытанні «адкуль, з чаго дзе што бярэцца, вось гэта, тое як завецца» (Якуб Колас). Так мы дайшлі б і да школьных гадоў паэта, але мне трэба было ехаць у Задуб'е, а Аляксея Піліпавіча чакалі дома. Развітваўся я з ім з думкаю пра наступную сустрэчу. І ўсё нейк не ўдавалася мне выбрацца ў родную старану. Калі ж на пачатку гэтага года я пазваніў былому дырэктару Малкавіцкай школы Мікалаю Піліпавічу Сайку, дык пачуў ад яго, што Аляксей Лагвіновіч пакінуў нас…

Успамянуўшы тут добрым словам самага старэйшага з братоў паэта Івана Лагвіновіча, я не апускаю рукі. Спадзяюся, што сёлета мне ўдасца прыехаць у Малкавічы. Яшчэ ж жывыя людзі, якія добра ведалі малога і маладога Івана Лагвіновіча, якія разам з ім хадзілі ў школу, гулялі ў гульні. І мае звесткі да біяграфіі паэта папоўняцца. А што яго біяграфію трэба пісаць — бясспрэчна. Бо паэт ён добры, цікавы, ад Бога.

Анатоль Сідарэвіч



Іван Лагвіновіч пахаваны на могілках у вёсцы Малкавічы

«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 2 (102) | 27 лютага 2015 | № 8 (425) Новы Час

Прыступкі да храма Святога духа



Людміла ПАЎЛІКАВА-ХЕЙДАРАВА

Мы — беларусы

«Exegi monumentum» — я помнік узвёў (лат).
Квінт Гарацый Флак

З нас кожны ўзводзіць помнік у народзе!
Над ім не ўладныя прасторы і часы,
ён з зорамі над цемрай узыходзіць,
ён з сонцам узнімаецца з расы,
каб полым слова нашага не згаснуў —
ён спеўны, ён журботны, шапаткі,
у красках ён, як вочы дзетак, ясных,
і першыя вясновыя шпакі
лятуць у ім, і коткі гострацъ кіпці,
і певень б'е крыламі на зары,
паўсюдны ён, куды пагляд ні кіньце,
адкрыты ўсім — на саменькім зыры!–
ён рык зуброў, грымоты навальніцы,
уплецены ў купальскія вянкі,
ён звонам урачыстым са званіцы
зрываецца ў наступныя вякі,
вада нагбом — сцюдзёная, хмяльная,
пакладзенае зернейка ў раллю —
ён цішыня на золаку, якая
яднае ў свеце неба і зямлю.
Пульсуе ў ім, не ведаючы зводу,
святло сусвету, час і наша кроў.
Мы пакідаем помнік свой народу —
сваё жыццё, свой плён, сваю любоў.

Верш удзячнасці Пімену Панчанку

І страшна падумаць,
і страшна паверыць,
ва ўсё,
што было між людзьмі.
І што будзе?
І страшна,
як б'ецца аголена сэрца,
і страшна,
як б'юць па аголеным сэрцы,
якое з любоўю
аддадзена людзям.

Абпалена горла
пакутаю песні.
Як можна?!
Не пляскайце полымю ў ладкі!
Хвіліну маўчання! —
І сэрца ўваскрэсне,
любоў уваскрэсне.

І ўбачаць нашчадкі:
Як бацька
гатовы быў сына праклясці,
як рвалі мы жылы,
як рвалі нам нервы,
як страшна было —
узляцець,
а не ўпасці,
як мы адрадкаліся
Сорамам з Гневам.

Памяці Васіля Быкава

Дабрата — таксама зброя.
Васіль Быкаў, «Мёртвым не баліць».

У Радзімы ўсе сыны —
як найлюбшы, то ў ізгоях!
Воем стаўся ў час вайны —
праз жыццё застаўся воем.

Воем стаўся ў час вайны...
Лейтэнанты — Бог мой! — дзеці!
Не паменела маны
з тых часоў на белым свеце.

Ды і праўду адшукаць
на зямлі не палягчэла.
Ён адзін стаяў, як раць,
проці ўлады адзічэлых.

Каб пакінуць на вякі
запаветнае ад воя,
ведай, людзі-дзівакі:
дабрата — таксама зброя!

Дзён імклівых чарада...
Хай на яве, а не ў мроях
на зямлі адзінай зброяй
застанецца дабрата!

19.06.2014, Тарасава

***

За сонцам — след у след
зыходзяць нашы дні...
Адкуль ім знаць? — Не ведаюць яны,
што сонца — у няволі ў нас саміх...

***

Апокрыў жоўты над маёй журбой.
Між абразамі перад тварам смерці
усмешка птушкай спуджанай біецца.
І што жыццё? Уступ, адзіна скерца
да вечнасці. Мне страшна — не з табой!
Камечу шаль, каб не скамечыць сэрца...

31.05.2014

***

Заміж пупышак — смочак слівы,
пачуццяў, думак, слоў завея,
душа і вочы — насцеж...
Хіба ўсміхалася б табе я,
калі б была шчаслівай?
Аднак і ты — не шчасце...

26.04.2014

***

Восень няверная...
Месіва лісцяў, пачуццяў
сумам адмерана.
Ветру вучуся.
Імчуся.
Туды, дзе ні шляхоў, ні сірэн.
Праверана!
Свабода — у палоне вен
і вуснаў.
Прэч, вусціш!
Матор не глушу.
Імчуся!
...Восень.
Куды мне падзець душу?..

***

Няхай ты проста лёсу шал —
нябёс сягаючы, душа
гарыць. Прашу я, не спяшай!..

...А ты смяешся...

Ноч-крумкачыха не ўцячэ!
Я п'ю любоў тваіх вачэй,
Прашу, пабудзь са мной яшчэ!..


...А ты — смяешся...

31.05.2014

***

A. R.

Мой друг...
Паэт — не болей, чым вакзал
без часу, без раскладу, без дарогі,
дзе аб парог не выціраюць ногі,
а калі шчыра, збіты ўсе парогі.
Вакзал...



Забудзь. І хто табе сказаў?!

Паэт, мой друг, не болей, чым базар,
дзе прадаюць за гордымі радкамі
на сэрцы і за пазухаю камень,
дзе ўсё на коне — свет і драбяза,
дзе часам шчырасць — горай ад ляза.

Базар...
Не вер. І хто табе сказаў?!
Паэт не больш, чым Божая сляза...

23.07.2014, Менск

Танец любові

Першы, хто паведаміў
сваёй смяшлівай сястрычцы,
што яна прыгожая, дзе ты?
Вее сіверам ад твайго крыжа.
Бог з Табой!
Танчу з Паўночным ззяннем
над тваімі дарогамі.
Трэцякласнік, які прызначыў
спатканне той, да якой сеў
за адну парту...
І цяпер там няма нічога вышэйшага
ад чыгуначнага насыпу з мастом.
Бог з Табой!
Танчу з пранізлівым ветрам
між пралётаў маста
над стромай плынню маёй Бярэзіны...
Той, хто нахіліўся ў палову роста,
каб павесці нязграбную дзяўчынку
ў блізкім танцы на школьным ранішніку.
Пяць год яна расла да твайго пацалунка...
Бог з Табой!
Танчу са снегірамі
на зіхоткім голлі аснежанага саду...
Ты, хто падараваў мне сына...
Бог з Табой!
Танчу ў безданях сэрца
неўтаймоўны танец маці...
Юнак, які ля зорнага ляснога возера
назваў агаленую дзяўчыну
Багіняй Любові...
Дзе зараз яны, ручнікі нашых заручынаў?..
Бог з Табой!
...Танчу з золкамі на палотнах,
што выбельваюць ранішнія росы...
...Танчу са стракозамі пад спеў салаўёў
сярод пражэрлівых, гарластых жаб...
...Танчу з дажджом сярод гронак мокрага,
як і мой твар, бэзу...
...Танчу з небам,
якое кружыцца над тваёй галавой...
...Танчу сярод маіх ліхаманкавых вачэй,
скіраваных у твой пусты бок...

Прыступкі да храма Святога духа

S.T.

2

...на зорным гарышчы — каты і скразняк
а ты завітаў — і зняхчэўку світае
і нехта зямлю пад нагамі хістае
і мовіць баюся што-небудзь не так...

3

Быў дзень, як дзень. І той на выхадзе.
А з тэлефона голас густы:
— Памятаеш?.. XII-е стагоддзе...
Царква... На прыступках я і ты...

— Чакай! Не веру! На якім ты свеце?..
Хаця не важна, і я на тым...
— Ты памятаеш, як б'ецца маё сэрца?
Паслухай...

27.07.2014

Як чорта ў Гомелі лавілі

Непрыдуманая гісторыя



Ігар ПУШКІН

Здарылася тое на Магілёўшчыне. Бо некалі Гомель знаходзіўся ў Магілёўскай губерніі, затым Магілёў у Гомельскай… Дакладней кажучы, у Падняпроўі.

Здарылася тое ў час вялікіх катаклізмаў, пераўтварэнняў і эксперыментаў. Вайна, рэвалюцыя, зноў вайна, але грамадзянская. На гора ўсім — савецкая ўлада, часам ніякай. Ваенны камунізм, паўстанні, нэп, беларусізацыя, «паспыталі» РСФСР, затым БССР. Звычайны чалавек не ведаў, куды падзецца.

І вось у гэтай калатнечы з'явіўся на нашай зямлі «чорт». Ад пачатку яго ўбачылі ў Клінцаўскім павеце, затым у Гомельскім. Захваляваўся народ на рынках Гомеля і Навабеліцы, замітусіўся.

А пачалося ўсё, як заўжды… з бабы. У адной жонкі невядома як і невядома з якой прычыны апынуўся мужык у Амерыцы. Жыў бы сабе ціха і працаваў у капіталістычным свеце. Але ж закарцела яму паслаць жонцы даляраў. Напрыклад, дзвесце для пачатку. Ашчаслівіць гаротную. Сума для савецкіх часоў сярэдзіны 20-х гадоў XX стагоддзя вялізная. Не магла яна застацца без увагі грамады і тым больш чорта.

20 студзеня, атрымаўшы паведамленне аб тым, што ёй прыслалі 200 даляраў з Амерыкі, жанчына, не будзь дурніцай, пайшла ў сельсавет і заверыла паперку там. Ды хутчэй на пошту, але тая ўжо была зачынена. А ноччу, каля апоўначы, нехта пагрукаў у дзверы яе хаты. Яна не спала. Не верачы шчасцю, разлічвала, куды падзецць грошы. Набыць нешта — у крамах не было чаго. Схавацць да лепшых часоў, але куды? Думкі не давалі заснуць. А тут нехта швэндаецца ў позні час. Праз клопат не праявіла пільнасці. Без страху адчыніла дзверы. Перад вачыма стаяў чорт, які адразу запатрабаваў даляры. Баба чорту: «Пошта не працавала, няма ў мяне амерыканскай валюты!» Той у адказ: «Глядзі, нікому не кажы, заўтра па іх прыйду!»

На наступны дзень жанчына пайшла на пошту і, горка плачучы, атрымала перавод. Касірка, таксама баба, па-свойму, па-жаночаму, запыталася: «У чым справа?» А тая, не паспеўшы яшчэ адчуць сябе багацейкай, кажа: «Ноччу чорт да мяне прыйдзе па грошы». Ад пачуцця салідарнасці работнік пошты паабяцала прыслаць да яе міліцыянтаў.



І тыя ўдвох, увечары, прыйшлі да валютатрымальніцы. Адзін схаваўся ў сенцах, другі — у хаце. І зноўку, дакладна апоўначы, чорт з'явіўся. Той, што быў у хаце, — самлеў ад страху. Другі, што пабачыўшы, з сенцаў у хату — скок і адразу чорту: «Хэндэ хох». Прабачце, «Рукі ўгору!»

Чорт — істота паслухмяная. Звычкі не падпарадкоўвацца патрабаванням органаў не меў, таму загад выканаў.

Супрацоўнік міліцыі, служба такая, здзёр з чорта скуру. А пад ёй (дарэчы, была яна ад каровы) аказаўся старшыня сельсавета! Той, што завяраў жанчыне паштовае паведамленне. Пазней казалі, што гэта быў нехта з паштовых служачых. Але гэта няпраўда.

На працягу чатырох апошніх дзён студзеня па ўсіх прадпрыемствах Гомеля пашырыліся чуткі, што чорта злавілі, прывезлі ў горад, і міліцыя паказвае яго цікаўным. Прычым бярэ за гэта нядорага — усяго па 10 капеек з носа.

Народ закалаціла. Увечары, 31 студзеня, некаторыя рабочыя, несвядомыя, накіраваліся ў парк Луначарскага. Туды, па чутках, міліцыянты збіраліся прывесці чорта на агледзіны. Нехта часам крычаў: «Чорта вядуць!» Натоўп кідаўся ў той ці іншы бок, але на пазначаных месцах чорта не было. Затое была вялікая штурханіна.

У той жа дзень, крыху раней, каля сотні рабочых, не нейкіх там саматужнікаў, сабраліся каля рабачкаму саюза будаўнікоў. Уздоўж па вуліцы праходзіла калона міліцыянтаў з аркестрам. Самы дурны або нягеглы залямантаваў: «Вось чорта вядуць». Праўда, потым некаторыя казалі, што крычаў ён нешта іншае, накшталт «чэрці йдуць». Дакладна невядома. Тым не менш, падушыўшы адзін аднаго, рабочыя чорта так і не пабачылі.

На наступны дзень на кірмашы камусьці здалося тое ж. Людцы, забыўшы, чаго прыйшлі, кідаліся з боку ў бок. Нарэшце, у гэты раз самы разумны выказаў думку, што чорт знаходзіцца ў гарсавеце. Там яго будуць паказваць пасля дэманстрацыі кінакарціны. Усе пабеглі туды.

Вялікая колькасць жыхароў з Гомеля і навакольных вёсак увесь дзень гуртавалася каля гарсавета і штосьці выглядала ўнутры будынка. А тым часам у гарсавеце праходзіў пленум губвыканкама! Адказныя работнікі губерніі пад пільнымі позіркамі месцічаў усё ніяк не маглі засяродзіць сваю ўвагу на вырашэнні важных гаспадарчых і сацыяльных спраў. Таму пад вечар натоўп цікаўных у Гомелі быў разагнаны міліцыяй.

Куды падзеўся чорт, дакладна не вядома. Адзін бедалага з вёскі Стаўбуны Свяцілаўскай воласці казаў, што здаюць сяляне харчпадатак, а атрыманыя грошы з усёй губерніі чорт забірае. Затым разам з касірамі з губфінаддзелу збег за мяжу.

Калі хто сам хоча даведацца падрабязнасці таго, як лавілі чорта ў Гомелі, няхай звяртаецца ў Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці, фонд № 1, вопіс 1, справа 1938, аркушы 80–81…

Досвед выбараў



Зміцер ДЗЯДЗЕНКА

***

Каб электарат не пырскаў слінаю,
Каб яму альтэрнатыву даць,
Вырашылі ў нас абраць адзінага
І яго на выбары пасляць.

Кандыдатаў вартых набіраецца —
Як у паліклініцы чарга:
Кожны быць адзіным пагаджаецца,
Саступіць не хочуць ні фіга.

Той крычыць, што мае досвед выбараў,
Той — што ўладзе ён нясе каюк…
Прадказаць бяруся беспахібна я:
Зноў адзіных будзе дзесяць штук!

***

Я так спадзяваўся схавацца ад спорту:
Я нават сацсеткі адпрэчыў, на жаль.
Ды прас заявіў мне бравурным акордам,
Што «Даша ізноў настраляла медаль!»

Я выкінуў прас свой, падумаўшы: «К чорту!»
На ноўт з пыласосам накінуў вуаль.
Але і пліта заявіла мне горда,
Што «Даша ізноў настраляла медаль!»

Да тэхнікі страшна цяпер дакрануцца:
Ў яе алімпійскі ці шабаш, ці баль…
А краны равуць і ў гістэрыцы б'юцца,
Бо «Даша ізноў настраляла медаль!»

Беларуская антынародная п'еса «Надзея памірае апоўначы»

Першая дзея:
выходзіць Надзея.

Дзея другая:
на гадзіннік пазірае.

Трэцяя дзея:
памірае Надзея.

***

Я не стрымаю ані ўздыху, ані ўсхліпу:
такія сродкі — і марнуюцца дарма!
Краіна справілася ледзь з птушыным грыпам,
як навалілася свінячая чума.

Яна прыйшла — як падатковая, знянацку,
не папярэдзіўшы пра дату і пра час.
Як пераростак адбірае ў дзетак цацкі,
так нас пакінулі без сала і кілбас.

Мне давядзецца жыць цяпер
без пальцам пханай!
Усю зіму адно сядзі — грызі рублі.
Нібыта Гамлета, чатыры капітаны
майго кабанчыка вось гэтак звалаклі…

Гляджу на мяса на малюнках і карцінах —
і абураецца галодны арганізм:
спачатку птушкі, а цяпер дайшло
да свінак!
Напэўна, трэба гучна скардзіцца
ў Грынпіс…

Маёрскае танга

Рос гармідар п'яны
Ў зале рэстараннай.
Вы стаялі грозна, быццам БээМПэ.
Цяжка даступіцца
Ў вашыя граніцы…
Я спыніўся, як на КаПэПэ.

Я зірнуў па флангах,
Запрасіў на танга,
Быццам у атаку з месца вас падняў.
Раптам штосьь як вухне
Ў рэстараннай кухні,
І аркестар ціха задрыжаў.

У прыціхлай зале
Доўга танцавалі
Мы пад тое танга — енчыла зямля.
Я прытупваў ботам,
Вы шапталі ноты,
Асабліва часта ноту «ля».

Танга адгучала,
Уздыхнула зала,
Быццам у баях адбыўся пералом.
Вы па гэтай зале
Ціха пакульгалі —
Ад мяне хавацца за сталом.

З жыцця брытанскай арыстакратыі

Неяк у палаце лорды
Вывучалі ўслых акорды.
Доўга мучылі гітару —
Да прыходу санітараў.

*

Неяк лорд зазначыў лорду:
«Сэр, вы ставіце рэкорды:
Покуль мы галасавалі,
Вы два літры апрасталі!»

У адказ на гэта лорду
Апанент сказаў няцвёрда:
«Сэр, у нашай у палаце
Кожны сам за піва плаціць!»

*

Неяк лорд пакрыўдзіў лорда:
«Сэр, гучыце вы не горда!»
У адказ на гэта лорд
У калегу кінуў торт.

Жорсткі пацанскі раманс

Не пакідай мяне, каханая мая!
Ты прыгадай, як я насіў табе букеты.
І помнік Леніна запомніць наша лета,
Бо штоначы вакол яго рваў кветкі я,
наносіў шкоду камунальнаму
бюджэту…

Не пакідай мяне, не пакідай,
Бо горад з цяжкасцю забудзе
гэту страту.
І персанал дэпо заходзіцца ад мату,
Згадваўшы даўна крадзены трамвай,
Якім я дастаўляў цябе дахаты.

Пабудзь са мной наяве, а не ў сне!
Інакш табе будзе адзінока…
А калі не — я выб'ю табе вока!
Не пакідай, каханая, мяне.
І ні паўслова не кажы папроку!

«Мае героі былі рамантыкамі»

Іван Навуменка: сказанае застаецца

Гэтую гутарку з Іванам Якаўлевічам Навуменкам, якому ў лютым споўнілася б 90, я запісала ў 2003 годзе. Класіка заўсёды пацвярджае, што яна — блізкая, адначасова даступная і да канца неспасціжная, лёгкая ў кантактах і ў адну хвіліну прасвечвае субяседніка татальна, як рэнтген. Класіцы для гэтага ані не трэба рыхтавацца: гэта нам увесь час неабходна расці для сустрэч з ёю.

Іван Якаўлевіч Навуменка (16.02.1925–17.12.2006) — выдатны пісьменнік, якога ў Еўропе і свеце ўсё часцей будуць згадваць у кагорце Lost Generation writers: ён з тых, хто прыходзіў у еўрапейскую прозу 19–20-гадовым ветэранам, і не толькі з ваеннага акопа, але яшчэ і з акупаванай беларускай зямлі. Яго эстэтычным ідэалам была гарманічная паэтыка Якуба Коласа. Але ў многім ён перагукваецца з франтавікамі Рэмаркам і Гарэцкім таксама, хоць пісаў ужо не пра першую, а пра другую сусветную вайну і пра жыццё пасля яе.

Самы вядомы афарызм Івана Навуменкі — «кніга адкрывае свет». І яго ўласныя кнігі такія: ці былі яны створаны юнаком, захопленым філалогіяй, які вярнуўся з фронта ў інтэрнат на Нямізе, ці Народным пісьменнікам Беларусі, ці — літаратуразнаўцам-акдэмікам, дырэктарам Інстытута літаратуры беларускай Акадэміі навук, старшынёю Вярхоўнага Савета БССР... Усё, напісанае Іванам Навуменкам, нязменна пазначана адметнасцю яго пісьменніцкага таленту і самой асобы. Гэта заўсёды праніклівы погляд на жыццё і на сябе ў ім, прычым вельмі часта з усмешкай, іроніяй. Без унутранай установкі на экспансію, а наадварот, са схільнасцю да лірызму, псіхалагізму. Гэта вельмі пэўны асабісты выбар — з захаваннем уласнай пазіцыі, уласнай годнасці, самавітасці. Нездарма на пахаванні Івана Навуменкі над яго магілай прагрымеў вайсковы салют. Пісьменніцкае пакаленне шасцідзясятнікаў, да якога належаў Іван Навуменка, абараніла і памножыла гонар беларускай літаратуры праз цэлае стагоддзе, бо гэтым хлопцам-равеснікам было што сказаць. І Іван Якаўлевіч Навуменка не змоўчаў — расказаў.

Людміла СІНЬКОВА



Іван Навуменка — баявы старшына

Л. Сінькова: Іван Якаўлевіч, у сваіх творах Вы расказваеце пра юнакоў, менавіта ўчарашніх школьнікаў, якія трапілі на вайну, і пішаце пра гэта глыбей за іншых беларускіх пісьменнікаў. Скажыце, калі ласка, Вы свядома імкнуліся напісаць партрэт свайго пакалення, ці ён стварaўся сам сабой, па меры з'яўлення пэўных аповесцяў?

І. Навуменка: Я думаю, свядома, і ў гэтым, нават, бачу свой творчы лёс, бо лягчэй за ўсё мне пішацца пра тое, што бачыў на свае вочы, або сам перажыў, ці добра ведаю з чужых слоў. Менавіта гэтыя веды я лічу самымі важнымі і значнымі для маіх кніг. Іншых назіранняў у мяне не так ужо і шмат. Гэта тлумачыцца лёсам майго пакалення. Мы былі прывязаны да пэўнага месца: спачатку вучыліся 10 гадоў у школе, потым 5 гадоў у інстытуце. Таму ў нас не было магчымасці вандраваць па краіне, у адрозненне, напрыклад, ад М. Горкага, які абышоў амаль усю Расію. Ужо потым мы з Алегам Лойкам збіраліся разам абысці Беларусь. Людзі нават пасміхаліся — маўляў, абуліся ў лапці, павесілі торбы і пайшлі. У лапці мы не абуваліся, ішлі ў чаравіках, але ж прайшлі толькі Браслаўшчыну, азёры...

У сваім жыцці я, канечне, многае бачыў: быў на вайне і ў партызанах, шмат ездзіў, ведаю многія мясцовасці. І ў сваёй творчасці абапіраюся толькі на свой вопыт, на тое, што чуў, што бачыў, у чым непасрэдна прымаў удзел.

Л. С.: Тыя падзеі, якія Вы апісалі ў першых сваіх апавяданнях, пачынаючы з апавядання «Сямнаццатай вясной», сёння ізноў па-новаму цікавяць і даследчыкаў літаратуры, і чытачоў сталага ўзросту, і вучняў. Калі чытаеш пра апісанае Вамі жыццё ва ўмовах акупацыі, часам думаеш, што на фронце было лягчэй, і таму нездарма ўсе такірваліся туды. А Вы ж былі і ў падполлі, і ў партызанах, і на перадавой. Дык скажыце, калі ласка, дзе жыццё было больш складаным — пад акупацыяй ці на фронце?

І. Н.: Думаю, што ў акупацыі было складаней. І нават партызанам жылося цяжэй, чым на фронце. Мяне акупацыя застала ўжо пасля 9 класа... Для маладога чалавека — гэта вельмі змрочны час. Немцы зусім не цікавіліся, хочацца нам у школу ці не. Была адсылка ў Германію; галадалі, елі суп з якой-небудзь бруквы. Па ўсіх нашых высокіх парываннях ударыла акупацыя. Прыйшлі людзі з чужой краіны, у іх таксама ёсць дзеці, яны, каб нейк апраўдацца, паказвалі фотакарткі са сваімі дзецьмі, са сваімі «фрау». Але ж ты прыйшоў ужо ў якасці заваёўніка. Ды яшчэ немцы тыя самыя, што далі нам, скажам, Бетховена, музыку, філосафаў славутых. Гэтыя самыя немцы прыйшлі з дубінкамі гумовымі, расстрэльвалі, вешалі — поўная процілегласць таму, што давала Германія ў XIX ст. Прыйшлі як забойцы, як каты. І вось калі ласка, калі ты дзевяцікласнік, граматны чалавек, вось табе які лёс. Ну, канечне, моладзь не скаралася, у партызаны ішла, у пасёлку ствараліся падпольныя групы... Я расказаў пра ўсё гэта ў аповесцях «Сасна пры дарозе», «Вецер у соснах», «Сорак трэці»...

Л. С.: Іван Якаўлевіч, Вашы творы ў вялікай ступені аўтабіяграфічныя. Аднак, як адзначалі і Вы самі, і вядомыя беларускія крытыкі, абсалютна не трэба атаясамліваць героя Івана Якаўлевіча з самім Іванам Якаўлевічам. Тое ж і з Вашымі героямі. Яны (напрыклад, Мілаванаў у «Юнацтве») на фронце чытаюць Канта, Гегеля па-нямецку, Васіль (з той жа аповесці) чытае «Вікторыю» Гамсуна, па-польску спрабуе чытаць Рэмарка. Ці сапраўды на фронце было шмат такіх адукаваных хлопцаў?

І. Н.: Па-першае, не забывайце, што мы ўжо ж былі людзі фактычна сярэдняй адукацыі. Напрыклад, мае таварышы Іван Доўжык, Анупрэй Брэль... У нас вельмі дрэнна выкладалі нямецкую мову, і недзе ўжо перад 10 класам мы з жахам адчулі, што не ўмеем па-нямецку да дзесяці палічыць. Узяліся самі даганяць. Падручнік для 5 класа вывучылі назубок, але ж гэта таксама ўсяго 900 слоў. Ну яшчэ крыху павучылі.

А ў акупацыі, самае галоўнае, мы спрабавалі радыёпрыёмнік наладзіць, але ж было цяжка. І тады ўзнікла думка: а чым мы горш за немцаў, давайце тое, што яны для сябе пішуць, давайце і мы чытаць. Разумееце, мы ўжо пэўныя навыкамі аваладалі, і ўжо на першым годзе акупацыі чыталі нямецкую газету. Гаварыць не ўмелі. Гаворка, разуменне прыходзіць пазней, але трэба [лексіку] ведаць. Так і мае таварышы. Я не скажу, колькі ведаю слоў. Канечне, выхваляцца залішне нельга, але я любы тэкст газетны магу чытаць. Размоўнай мовай я больш-менш аваладаў у Германіі, таму што на кожным кроку пыталіся пра тое, другое...

Л. С.: У час вайны Вы былі ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай зоркі. І ў афіцыйнай літаратуры можна знайсці апісанне той аперацыі, за якую Вы гэты ордэн атрымалі. Раскажыце, калі ласка, як гэта адбывалася, бо ў нас не кожны народны пісьменнік, які трапляў на фронт, мае такія ўзнагароды.

І. Н.: Адразу хачу сказаць, што Чырвоная зорка не самы галоўны ордэн, і яго давалі многім...

Л. С.: Але гэтая аперацыя апісана ў адным з тамоў гістарычнай энцыклапедыі.

І. Н.: Так, я і сам вывучаю гісторыю і сапраўды знайшоў звесткі пра тую аперацыю. Рэч у тым, што ў канцы вайны ў нас (немцы гэтым карысталіся ў самым пачатку) нарэшце сталі падслухоўваць немцаў. Гэта не так складана. У бок нямецкай перадавой лініі працягваюць вусы, ці драты. І ляжыш ад гэтай перадавой за метраў 200–300. Апарат ёсць, называецца УСП (расшыфраваць не магу), і чуеш перамовы... Холад, зіма, паспрабуй паляжаць у гэтых бадылях і лазе. Уявіце сабе: Ганс пытае, што давалі на вячэру, а другі пералічвае. А мы не вельмі каб і накормлены, чуеш, як у жываце бурчыць. Або хто прыехаў з адпачынку, таксама дакладна пытае: што, як жонка...

У нас быў хлопец, які закончыў тэхнікум сувязі, нешта разумеў, таму мы і наткнуліся на рашэнне другое: што можна падземныя кабелі праслухоўваць. Прыстасаваліся. Дык гэта ж лепей — сядзіш у цёплым пакоі і чуеш не толькі, што роце давалі есці, а чуеш усё іншае, перамовы штабоў.

Нас было чалавек шэсць такіх. Мы армейская група разведкі былі, 21-й арміі. І вось мы пачалі перадаваць гэтыя звесткі ў штаб арміі. Што-небудзь цікавае зловіш, адразу хлопец — на матацыкл, едзе і завозіць у штаб арміі. А там зацікавіліся: адкуль яны такія докі. Адразу прыехалі тры ці чатыры палкоўнікі нас правяраць. Ну а як праверыць? Гітара была, палажылі на гітару гэтыя нашыя навушнікі, і з гітары чуваць: немцы гавораць, вось і палкоўнікам паказалі. Яны проста жахнуліся, што так гэта мы можам усё нямецкае чуць.

Была ў нас яшчэ адна вельмі важная справа, у Сілезіі, якая адыграла, можа, нават большую ролю, калі гаварыць пра ўзнагароды. Мы падслухалі з нямецкай размовы, што непадалёк ад нашага армейскага штаба немцы збіраюцца ўзарваць вадасховішча Отмахау. Інфармацыю адразу ж перадалі. Вадасховішча і сапраўды ўзарвалі, але былі выратаваны жыцці многіх людзей. Гэты выпадак апісаны ў адным з тамоў энцыклапедыі.

Л. С.: У Вас многа напісана, асабліва ў аповесці «Юнацтва», пра тое, якое цяжкае і складанае жыццё прыйшлося на долю школьнікаў, падлеткаў, юнакоў. І ўсё ж такі Вашы героі выглядаюць ідэалістамі, адданымі сваёй справе. Відаць, ідэалізм лепш, чым прагматызм?

І. Н.: Мае героі не былі прагматыкамі. Мае героі былі рамантыкамі, а рамантыкі — гэта тое ж самае, што ідэалісты. Цяпер гляджу я на гэты, як Вы кажаце, прагматызм... А жылі ж усе яны, юнакі і дзяўчаты, цяжка; добра, што маглі купіць якую-небудзь кофтачку, а некаторыя нават марожанага не каштавалі. У армію, на фронт... Дзе тут ужо прагматыкам быць? І потым сядзелі гэтыя хлопцы і дзяўчаты па інтэрнатах...

Л. С.: Ды насуперак усяму — яшчэ і марылі пра каханне! Іван Якаўлевіч, як мне здаецца, беларускія пісьменнікі вельмі часта баяцца тэмы кахання. А Вы ў сваіх творах, апісваючы нават самыя цяжкія ўмовы ваеннага жыцця, надаяце гэтаму пачуццю асаблівае значэнне. Гэтым асабліва прыцягваюць Вашы творы: «Вераніка», «Сямнаццатай вясной», «Верасы на выжарынах», «Па махорку», «Таполі юнацтва», «Трымценне дубовага лісця», «Месячная ноч», «Ноч у літоўскім гарадку», аповесць «Апошняя восень»...

І. Н.: Гэтыя хлопцы і дзяўчаты былі кніжнікамі, яны многа чыталі, напрыклад, той самай французскай літаратуры, дзе каханне на кожным кроку. Ну і дзесьці па-рыцарску разумелі яго. Маўляў, вось здзейсню нешта ў жыцці, інстытут скончу, а яна ўжо, дзяўчына каханая, так сказаць, ухваліць заслугі... Карацей кажучы, каханне — як нейкі рыцарскі абавязак, доўг. І канечне, не заўсёды гэта спраўджвалася... Увогуле, я Вам скажу, беларускім хлопцам, яшчэ ў значнай меры ўкраінскім, вайну прыйшлося спазнаць адразу. Мы ж прыгранічныя...

Л. С.: Ваш герой лёгка пазнаецца, у ім можна ўбачыць і самога беларуса, і яго нацыянальны характар. Яму ўласцівы не толькі рамантызм, летуценнасць, душэўная адкрытасць і ранімасць, але яшчэ і працавітасць, і цягавітасць. Ваш герой-разведчык (напрыклад, Сяргей Каліноўскі са «Смутку белых начэй») можа сядзець у навушніках і падслухоўваць немцаў 14–16 гадзін у суткі; спаць, ідучы маршам; трываць боль ад раненняў па-за шпіталем і заставацца жывым у самых цяжкіх баях...

І. Н.: Мы перажылі акупацыю, зведалі шмат цяжкасцей і прыйшлі ў Германію... я апісаў адну гісторыю, праўда, яшчэ не друкаваў. Мы стаялі на Каспарскай зямлі. Гэта старая польская тэрыторыя, якая даўно была захоплена немцамі, і мясцовыя жыхары — палякі — ужо нават анямечыліся. Калі скончылася вайна, мы там неслі гарнізонную службу. Месяцы тры.

І калі мы адтуль выязджалі, наша начальства вельмі баялася, каб не здарылася чаго-небудзь выключнага. А яно здарылася. Мы выязджалі на машынах, таму што полк сувязі заўсёды мае свой транспарт. Уяўляеце сабе: выязджаем вечарам, прыцемак, і тут палавіна жанчын гэтага гарадка, і бальзакаўскага ўзросту, і дзяўчаты, сабралася каля нашых машын — і не саромеюцца, плачуць. Я падумаў: і сапраўды, а што іх чакала? Кінахроніка паказвала, як іх мужы, гаспадары маршыруюць... Яны ж у сваёй жаночай адзінокасці праводзілі гэты час, і пагэтаму — ніякага сораму. Калі перанеслі час ад'езду нашых салдатаў на ноч, жаночы натоўп яшчэ пабольшаў: ноччу ж ніхто не бачыць. Вось так канчаюцца войны. Жыццё ёсць жыццё. Вайна пачалася ў 39-м годзе, скончылася ў 45-м. За гэтыя 6 гадоў вайны, пры Гітлеры, там, у Германіі, былі нашы людзі, палонныя. Але ж за сувязь з іншаземцам жанчын там моцна каралі.

Л. С.: Многія беларускія аўтары апісвалі той жа самы перыяд, закраналі тыя ж самыя тэмы, але пры гэтым кожны застаўся індывідуальнасцю. Як у Вас складваліся адносіны з пісьменнікамі свайго пакалення, з кім Вы сябруеце?

І. Н.: Мне не прыйшлося дзяліць з кім-небудзь славу, неяк мірна было. Не хачу называць асобныя прозвішчы. Вось адзін з пісьменнікаў, які памёр ужо, перад смерцю напісаў дзённік, дзе выказаў усе свае крыўды. Я лічу, што такога нельга рабіць. Перад смерцю трэба ўсім дараваць.

Л. С.: Канечне, павінны быць пэўныя хрысціянскія каштоўнасці. А ў Вас ёсць дзённік?

І. Н.: Нашто мне дзённікі, калі ўсё мае апавяданні друкуюцца? Праўда, у мяне ёсць многа чаго ненадрукаванага.

Л. С: Іван Якаўлевіч, у Вашай прозе шмат гумару, можна сказаць, што гэта ўвогуле адзнака Вашай творчай індывідуальнасці. А як Вы ставіцеся да эпіграм у свой адрас? Вось, напрыклад, у паэме «Сказ пра Лысую гару» пра Вас сказана, што «ўсе прафесары, дацэнты перад Навуменкам адным, нібыта дробязныя цэнты перад далярам залатым»...

І. Н.: Я тады якраз з'ездзіў у Амерыку, на асамблею ААН, адсюль і даляры. Гэта стыль Ніла Гілевіча — я сам гэта бачыў яшчэ раней, чым Гілевіч прызнаўся, што паэму ён напісаў. Аўрамчык толькі дапамагаў яму. «Турнэпсы ўволю хрубашчу...» — гэта стыль Гілевіча.

Гумар — гэта ўвогуле прыкмета беларускага светаадчування. Беларус ніколі не быў залішне багатым, ён проста жыў і з усмешкай адносіўся да навакольнага свету. І калі гаварыць пра нашу літаратуру — гэта я ўжо як літаратуразнаўца гавару, — то гумар можна знайсці амаль у кожнага нашага пісьменніка. Ад нашых ананімных паэм, Дуніна-Марцінкевіча, Багушэвіча да Купалы, Коласа і інш. Купала — «высокі рамантык», але таксама не мог абысціся без гумару. Напрыклад, ягоная «Паўлінка» ўся пабудавана на гумары. Дарэчы, камедыю такога ўзроўню больш ніхто ў Беларусі так і не напісаў, не здолеў напісаць. Купала здолеў стварыць гумарыстычныя вобразы (пан Быкоўскі, Мікіта Зносак і інш.).

Л. С.: Вашыя навуковыя кнігі — «Янка Купала: Духоўны воблік героя» і «Якуб Колас: Духоўны воблік героя» — былі абсалютна новым словам у нашай навуцы. Тады ж і сітуацыя была іншая ў краіне, і так атрымалася, што менавіта Вам прыйшлося адкрыць па-новаму гэтых пісьменнікаў. Як пісаліся гэтыя кніжкі?

І. Н.: На той час рэктарам нашага ўніверсітэта быў Сеўчанка, які да мяне ставіўся вельмі прыязна. Ва ўніверсітэце тады адчуваўся дэфіцыт дактароў навук. І вось Сеўчанка мяне проста прымусіў напісаць кнігу: «Напішы ты, няхай у нас доктар будзе». Гэта быў 1964 год. Я ўжо 10 гадоў працаваў, меў нейкі вопыт, і сам думаў пра творчасць Я. Купалы, Я. Коласа. Не адразу, канечне, але гады за тры-чатыры напісаў я кнігу. Янка Купала і Якуб Колас былі вельмі мудрымі. Яны шмат зрабілі для беларусаў, якія ў славянстве амаль ці не самымі апошнімі прыйшлі да ўсведамлення таго, што ёсць беларускі народ, ёсць беларуская нацыя. Пісьменнікаў такога кшталту, такога гарту не кожны народ мае.

Л. С.: Іван Якаўлевіч, Вы і раней пісалі пра Дуніна-Марцінкевіча, Змітрака Бядулю, Максіма Багдановіча, а цяпер зноў вярнуліся да іх постацяў. У Вас выйшла кніга «Ранні Кузьма Чорны», у якой Вы закранаеце зусім новыя, адрозныя ад сказанага раней беларускімі навукоўцамі, аспекты, характэрныя для творчасці гэтага пісьменніка. Як у Вас узнікла цікавасць да павеваў мадэрнізму, імпрэсіянізму ў ранняга К. Чорнага, у З. Бядулі, у М. Багдановіча?

І. Н.: Я прыйшоў да высновы, што мы часта адкідваем тое, што нельга адкідваць, таму што гэта з'яўляецца часткай светапогляду пісьменніка. Напрыклад, з творчасці Кузьмы Чорнага я асабліва люблю апавяданні. У яго і «вецер за балотам нарадзіўся і ляціць», і «дрэвы шумяць». Я лічу, што апісанні і ветру, які ляціць і несе пахі, і іншых прыродных з'яў пашыраюць дыяпазон бачання пісьменніка. Дарэчы, Чорны валодаў прыёмамі, характэрнымі і для творчасці Гамсуна. У той жа час абодва пісьменнікі былі рэалістамі.

Л. С.: У Вас напісана шмат твораў і для дзяцей. Некаторыя з іх уваходзяць у школьную праграму. Гэта і «Вайна каля Цітавай копанкі», і «Пераломны ўзрост», і для старэйшых — «Дзяцінства. Падлетак. Юнацтва». А якія са сваіх твораў Вы паставілі б у школьнай праграме на першае месца?

І. Н.: Даўно знаёма чытачу аповесць «Вайна каля Цітавай копанкі». А ўвогуле, няхай выбіраюць складальнікі праграм.

Л. С.: Іван Якаўлевіч, а як Вы ставіцеся да думкі, што ў выкладанні літаратуры трэба больш падрабязна гаварыць пра пісьменніка як асобу — яго асабістае, нават прыватнае жыццё. Напрыклад, мы шмат ведаем пра інтымнае жыццё Байрана, Пушкіна і іншых замежных і рускіх пісьменнікаў, а пра беларускіх вельмі мала.

І. Н.: Я цалкам згодны з гэтай думкай. Калі ведаеш пісьменніка з гэтага, інтымнага боку, больш разумееш і яго творы. Ну, скажам, Кузьма Чорны. Яны разам з Язэпам Пушчам паехалі ў Слуцк, горад, блізкі Чорнаму, і пазнаёміліся там з дзяўчатамі. Чорны быў рамантык. І вось Язэп Пушча выбраў сабе дзяўчыну, якая за ім паехала ў ссылку, як жонкі дзекабрыстаў. А Чорны вадзіў сваю абранніцу па рэстаранах тут, у Мінску. І яна вельмі хутка знайшла сабе каханка. Я не ведаю, ці жывая яна. Можа, прозвішча не будзем называць? Чорны напісаў пра гэта, яно ёсць у апавяданні «Пачуцці», там ёсць цыганка Нона. Ніякая гэта не цыганка, гэта была мясцовая дзяўчына. Ён напісаў дакладна. Гэта быў таксама вялікі пісьменнік, псіхалогію ведаў.

Л. С.: На Ваш погляд, якія часы ў Саюзе беларускіх пісьменнікаў былі асабліва яркімі, цікавымі? Як правіла, складаныя часы нараджаюць значных асоб, з якімі мы звязваем гісторыю літаратуры...

І. Н.: Я лічу, што да такіх асоб можна аднесці пісьменнікаў старэйшага пакалення. Яны былі, канечне, цікавымі і прынцыповымі. Ва ўсякім выпадку, нельга было чакаць ад таго ж Мележа ці Брыля, каб яны недзе «хістануліся».

Л. С.: А па жыцці Вы аптыміст ці песіміст? У чым знаходзіце падставу для аптымізму, для добрага настрою?

І. Н.: Асабіста я вельмі залежны ад настрою. Аднак лічу, што пры стварэнні свету Бог усё прадумаў, і краху заўтра не трэба чакаць.

Цяпер я вельмі захапіўся гісторыяй Хрыста. Гэта магутная фігура, хоць і да гэтага часу цягнуцца спрэчкі наконт рэальнасці яго існавання. На мой погляд, у «Бібліі» залішне апісанняў самых розных цудаў. Цяпер і самі царкоўнікі хочуць, каб святыя кнігі былі больш праўдападобнымі. А Хрыстос — гэта ўсё ж такі міф. Шкада, што мы ў сваім дзяцінстве і юнацтве былі далёкімі ад хрысціянства. Я помню, што дзед мой вельмі цікавіўся хрысціянствам, і мне ўсе казанні папа́ пераказваў пасля наведвання царквы. І вадзіў на споведзь, я спавядаўся. Недзе ў 8 гадоў поп даў мне лыжачку гэтага прычасця, а я сказаў: «Дай яшчэ». Адзін раз я пайшоў таксама спавядацца, і спавядалася дзяўчына з нашага класа. Сама спавядалася, але гэта не перашкодзіла ёй данесці на мяне, што быў у царкве. І назаўтра (у нас лінейкі былі, асабліва ў першых класах) дзяжурны крычаў на лінейцы: «Ён цалаваўся з папом». З папом я не цалаваўся, не дапусціў сам бацюшка да гэтага. Але ўжо й бічавалі мяне... [Сучаснай] генерацыі дзяцей трэба з хрысціянствам знаёміцца. Уявіце сабе, а што мы зналі пра чалавека, што так ужо адкідвалі: хто збудаваў гэты свет, як ён збудаваўся. Мы ж і самі не ведаем.

Л. С.: А як у Вас асабіста складваюцца адносіны з дзецьмі, з унукамі? Вашы дзеці (а гэта вельмі аўтарытэтныя, з акадэмічнымі ступенямі, прафесіяналы — урач і літаратуразнаўца ў Мінску, музыказнаўца ў Маскве) усе гавораць па-беларуску, што, дарэчы, не заўсёды бывае ў сем'ях нашых класікаў.

І. Н.: Па-першае, я не класік, таму і гавораць! Я сваімі дзецьмі і ўнукамі задаволены. Яны не баяцца мяне часам і пакрытыкаваць, але я лічу, што гэта нармальна. Дарэчы, маршал Жукаў прызнаўся, што акрамя рускай мовы ён ведае яшчэ і беларускую. У гэтым двары, па вуліцы Карла Маркса, 36, дзе мы з Вамі знаходзімся, хадзіў Жукаў; гэты нізенькі дамок, бачны з акна — былы штаб беларускай [вайсковай] акругі. Жукаў быў у Мінску камандзірам кавалерыйскага палка. А там, у Ратамцы, — іпадром, кавалерысты жылі. Ва ўсякім выпадку, Жукаў сказаў, што беларускую мову ён ведае. Я праверыў: Жукаў чытаў ваенную справу ва ўніверсітэце. А тады беларусізацыя ішла, прымушалі. Прадмет выкладаеш, беларускае войска ёсць? Ёсць. Уявіце сабе: Жукаў — ён, «цвёрдакаменны» — чытаў ваенную справу па-беларуску!

Л. С.: Вы загадвалі кафедрай беларускай літаратуры БДУ ў той час, калі там працавалі вельмі цікавыя людзі. Многія з іх і цяпер працуюць. Ці не збіраецеся Вы напісаць пра гэта? Вы былі таксама і дырэктарам Інстытута літаратуры, і старшынёй Вярхоўнага Савета Беларусі ў цікавыя, вырашальныя 1985–1990-я гады. Ці не ўзнікала жадання напісаць пра гэты перыяд?

І. Н.: Гэта як напісаў Іван Шамякін у «Начных успамінах»? Не, я так не збіраюся. Разумеце, людзі, калі называць іх, пакрыўдзяцца дзесьці... зрэшты, пабачым...

Л. С.: Для пісьменніка вельмі важна, каб большая колькасць чытачоў з яго тэкстамі пазнаёмілася. Але часта пісьменнікі застаюцца незадаволенымі тым, як іх творы перакладзены на іншыя мовы. А якія з перакладаў Вашых твораў Вам найбольш падабаюцца?

І. Н.: Мне асабліва пашанцавала з перакладамі на рускую мову, першыя з якіх у Маскве зрабіў такі аўтарытэтны чалавек і для нас, і для рускай літаратуры, як Яўген Мазалькоў. Ён пераклаў, па-мойму, і «Сасну пры дарозе», і «Вецер у соснах», і «Сорак трэці». З яго лёгкай рукі і пайшло. Потым мае творы перакладала сямейства Гарбачовых, якія працавалі ў выдавецтве «Советский писатель». Менавіта ў гэтым выдавецтве выйшла большасць з 20 маіх кніг, перакладзеных на рускую мову. Аповесць «Друзья-товарищи» выйшла ў «Молодой гвардии», у іншых выдавецтвах друкавалі. Нават удалося сярод нашых класікаў надрукавацца ў «Роман-газете» — там такая «варта» стаіць! Потым — у падпісных выданнях, у дадатку да часопіса «Дружба народов», там тыраж вялікі быў. Цяпер нават у Маскве такіх тыражоў не робяць.

Л. С.: Каб займацца філалогіяй як навукай, трэба шмат чытаць і шмат пісаць. У кожнага чалавека бываюць перыяды апатыі. Ці не стаміліся Вы ад філалогіі? Ці не расчараваліся ў ёй?

І. Н.: Не, не расчараваўся. Я ні для чаго другога не годны.

Л. С.: А ўвогуле, акрамя кніжак, у Вас ёсць якія-небудзь захапленні?

І. Н.: Гэта лес, грыбы... І яшчэ — раней я даволі часта займаўся параўнальным мовазнаўствам. Яно цікава ў тым сэнсе, што дае нам інфармацыю пра лёс народаў, карані якіх жывымі засталіся толькі ў мове.

Людміла Сінькова: А як Вы думаеце, ці змогуць паўплываць на літаратуру новыя тэхнічныя сродкі: відэа, інтэрнэт?

Іван Навуменка: Яны ўжо, канечне, паўплывалі. Але нічога. Літаратура будзе жыць. А нашы пісьменнікі-класікі будуць запатрабаванымі і ў XXI стагоддзі.



Дактары навук філфаку БДУ: Іван Навуменка, Людміла Сінькова і Алег Лойка



Сахалінка



Андрэй ФЕДАРЭНКА

I

Яна прыехала ў вёску ў верасні і засялілася ў хатцы на пагорку каля студні — акурат насупраць хаты Васіля Ропата.

«Зброд», — першае, што падумаў Ропат, які адчуваў інстынктыўную варожасць да ўсяго нетутэйшага, не мясцовага.

Ён стаяў у сваім двары каля плота нябачны, надзейна схаваны зараснікамі дзікіх сліў і, адхінуўшы калючую галіну, у прасвет назіраў за няпрошанай суседкай. Адсюль усё было відаць як на далоні. Студня, пагорак, голы двор, нават плотам не абнесены (сам Ропат разабраў яго і перацягаў на дровы), старая хатка, якую з незапомных часоў, колькі яна існавала, людзі чамусьці звалі «сахалінская», і ўсе, хто ў ёй жыў, кожная сям'я — а такіх на вяку Ропата памяталася не менш за дзясятак — аўтаматычна набывалі мянушку «сахалінцы»; і праўда — усе жыхары гэтай хаты былі крыху падобныя абліччам на тунгусаў ці якутаў: можа, цяклі ў жылах кроплі адной крыві, з'яўляліся яны якой далёкай раднёю і іх, панасіўшы па свеце, прызямляла ў родным куце, а мо проста, пажыўшы тут, у адным месцы, у гэтых сценах, пакрысе набывалі паміж сабой падабенства, — так з часам і сабакі робяцца падобнымі да сваіх будак.

Гэтая новая «сахалінка» таксама была скуластая, вузкавокая, худая. Яна патулялася па двары, схадзіла да студні; калі ішла адтуль з вядром вады, роўна трымала спіну, нават падавалася крыху наперад, нібы ішла супраць ветру. Потым, не ведаючы, што рабіць, куды сябе прыткнуць, пазяхнула, прысела на ганку, закурыла, суха пакашляла.

А Ропат стаяў і назіраў за ёю ўжо амаль адкрыта. Ён ведаў, што ні яго самога, ні ягонай хаты чужынцу так проста не разгледзець. Увесь яго двор ад ганку да веснічак, па ўсім перыметры плота да кожнага кутка надзейна, ушчыльную зарос цярноўнікам, лазняком, дзікімі слівамі, акацыяй і ляшчынаю, сям-там пракідаліся нават калючыя асінкі, якія звінелі сваім лісцем без ветру. Быў час, калі Ропат ваяваў з гэтай пошасцю: высякаў, вытручваў, выкопваў... Але хутка скеміў, што лепшай хованкі для сябе не прыдумаеш, і пакінуў усё як ёсць.

Цяпер гэтае дабро, самая разнастайная расліннасць вольна выпірала з зямлі, прычым чамусьці не хацела расці ўгору, а імкнулася, можа, ад цеснаты, слацца па зямлі, расла крыва, коса, чаплялася адно за адно, перавівалася, як ліяны, абплятала павоем шулы, вароты, веснічкі, плот, хаваючы ўсё гэта ад цікаўных людскіх вачэй, — і нарэшце злучалася над самым дахам зялёным шатром: так, што ўся хата аказвалася схаванай і з бакоў, і зверху, а Васіль Ропат жыў, як у лесе ў будане. Хіба калі добра прыгледзецца, можна было заўважыць вузенькую, у крок шырынёю сцяжынку, якая зладзеявата нырала з вуліцы ў гэтыя шаты, ды яшчэ позна ўвосень, калі лісце ападала, ці ўвесну, калі спаўзаў снег, знянацку адкрывалася вачам праз голыя галіны нейкае фантастычнае, казачнае, нібы ў Лесавіка ці ў Бабы Ягі, жытло; быццам сашморгнулі публічна апранахі са старога чалавека, і вось стаіць ён перад усімі безабаронны, сарамлівы... Але нядоўга так было. Узімку перш шэрань, а потым снег усё бяліў, раўняў, пульхным футрам клаўся на галіны і апранаў Ропатава логавішча. Толькі дым падымаўся з коміна ды сцежка крыху цямнела на белі. А ўвесну шпарка пачынаў зелянець яго двор, і зноў усё хавалася, як і хацеў Ропат.

II

«Хто ім тут мёдам мажа? — думаў Ропат, гледзячы на чарговую «сахалінку». — Чаго яны спаўзаюцца сюды з усяго свету? Чалавек дзе нарадзіўся, там павінен і памерці...»

Яму было прыкра, горка, што ён, тутэйшы жыхар, стары чалавек, вымушаны, як злодзей, хавацца ад людзей у зарослым двары ўласнай хаты. Ён даўно перастаў адчуваць сябе тут, у роднай вёсцы, гаспадаром. І толькі калі-небудзь са здзіўленнем перапытваў сябе: як жа яно так сталася? Калі пачалося? З якога часу вёска пачала напаўняцца, як саранчой, гэтымі прышлымі людзьмі? Яны скуплялі старыя хаты, будавалі новыя, і ўсё ім было мала, і ўсё іх большала, большала, яны распаўзаліся, нібы бружмель у Ропатавым двары, паступова, але няўмольна выціскаючы старога Ропата з яго асяродку, а самі — па законах фізікі — запаўняючы вызваленую прастору.

Ропат бачыў у гэтых людзях адну толькі небяспеку для сябе і грэбліва называў іх адным кароткім словам: «Зброд». «Зброд» дзяліўся на дзве катэгорыі. У першую ўваходзілі розныя прыблуды — мужчыны і жанчыны, старыя і маладыя, пагарэльцы, бежанцы, беспрытульнікі без роду-племені, з нейкіх такіх краёў, пра існаванне якіх Ропат ніколі не чуў і нават не ведаў, што такія ёсць на свеце. Іх дапаўнялі прышлыя з блізкага горада — самая розная непатрэбшчына, чалавечае шалупінне, ні Богу свечка, ні чорту качарга. Гаспадаркі яны не вялі, жыўнасці не трымалі; запушчаныя агароды, соткі, парослыя ляснымі дрэўцамі, някошаныя паплавы — толькі трава-самасейка пад акном, тры кветкі ды дзікі куст маліннiку. Усе непапраўныя, нейкія адчайныя гультаі, яны не саромеліся свайго гультайства, а нават нібы ганарыліся ім, жылі як папала і на што давядзецца. Некаторыя зімою знікалі, увесну зноў з'яўляліся. Улетку збіралі і здавалі ягады, лісічкі. Карацей, чорт іх ведае, як, за што яны жылі. Можа, атрымлівалі ад дзяржавы дапамогу.

Другую частку складала мясцовая арыстакратыя — дачнікі, у асноўным адстаўныя вайскоўцы, маладыя пенсіянеры. У свае 45 яны ўжо не працавалі. Гладзілі жываты, атрымлівалі неверагодныя — і лічба такая на паперцы не змесціцца — пенсіі, прычым умудраліся адразу ў двух месцах: тут і яшчэ недзе, дзе раней служылі. Іхнія жонкі (новая вясковая мода), маладыя «бабулі», днямі гулялі па вуліцы, адной рукой штурхаючы перад сабой дзіцячую каляску, а другой — уціскаючы ў вуха мабільнік. Усе яны мелі ў горадзе кватэры, але жыць хацелі тут, а кватэры здавалі ці пакідалі дзецям.

Вось гэтыя і былі тут сапраўдныя ўладары, паводзіліся, як дома. Адзін на аднаго гледзячы, нібы спаборнічаючы, яны ўпарта з вясковых хат ляпілі загарадныя катэджы. Агароды іх былі ператвораны ў вялікія парнікі, у дварах — па дзве машыны, кожны «катэдж» збоку меў спадарожнікавую талерку, каля варот на вуліцы — вазончык або клумбу з кветкамі. Траву ў дварах касілі не менш як два разы на дзень, і не косамі, а траскучымі трымерамі. Яшчэ заможнасць іх вызначалася па тым, якія былі ў іх платы і вароты, наколькі яны былі надзейныя, высокія, чыгунныя або каменныя, літыя або каваныя, металічныя або з цяжкіх драўляных брусоў, перакрыжаваных жалезнымі пласцінамі, — звычайна на гэта ішоў граб альбо прасмалены дуб.

Наўскасяк ад Ропата цераз вуліцу жыў нейкі таямнічы бізнэсмэн, адгароджаны ад усіх, як Ропат сваімі зараснікамі, трохмятровай каменнай сцяной, за якой разводзіў на продаж в'етнамскіх свіней. Ропат ніколі не бачыў іх, не ведаў, як яны выглядаюць, але каля аўталаўкі расказвалі, што гэта проста пачвары з неверагодна моцнымі, дзіўна сашчэпленымі сківіцамі: могуць жэрці цэглу, дрэва, а калі забудзеш пакарміць — ядуць зямлю пад нагамі.

«...Плодя тем самым свиную чуму и прочую нечисть», — падводзіў вынік дзед — Ропатавых гадоў, толькі ў адрозненне ад Ропата заўсёды бадзёры, жвавы, актыўны, у капелюшы, камізэльцы, у акулярах, у ваенных штанах з выцвілым кантам. Гэта быў стары мовавед, філолаг, які з маніякальнай настырлівасцю не стамляўся папраўляць у словах націскі, ваяваў з беларусізмамі; калі чуў ад каго мясцовае слова, нават выпадкова прамоўленае, яго як электрычным токам біла, да шаленства даводзіла, і ён ледзь палкаю не замахваўся.

«Как-то пришло письмо, — расказваў ён з абурэннем, — орали сотки... Я испугался, думал, переругались, а это, оказывается, пахали! Или — густка. Неужели так сложно сказать — платок? Зачем густка, причём густка?!»

Трохі далей, у старэнькай, яшчэ горшай за сахалінскую, халупе ашываліся бацька і сын Ісаевы. Аднаму было 50 гадоў, другому 25. Стары — адстаўны маёр Ісаеў Максім Ісаевіч, малады — Ісаеў Максім Максімавіч. Абодва ў ваенных абносках, абодва падобныя на ваеннапалонных ці на дэзерціраў, заўсёды хадзілі разам, заглядалі ў двары. Абодва, як большасць беспрабудных п'яніц-бабылёў, былі добрыя, але і дабрыня іхняя насіла нейкі бесталковы, праз меру мітуслівы характар: спачатку яны прасілі грошы, потым — выпіць, пад канец — закурыць і, не атрымаўшы ні таго, ні другога, ні трэцяга, ветліва прасілі прабачэння. Нарэшце сама далей ад Ропата, на перакрыжаванні вуліц, там, дзе звычайна спынялася аўталаўка, узвышаўся ладны двухпавярховы катэдж, куды прыязджалі на лета Барыс з Раяю. Барыс, таксама малады ваенны пенсіянер, жартаўнік, яшчэ здалёк пабачыўшы старога Ропата, кожны раз крычаў:

«Ропатавіч!» — ужо ў самім гэтым здзекліва-панібрацкім звароце знаходзячы смешнае, бо ў Ропата ж было імя — Васіль, і па-бацьку –Уладзіміравіч.

«Ропатавіч!» — крычаў Барыс, а калі дзед спыняўся, Барыс не ведаў, што казаць. Такія ў яго былі жарцікі.

Раней, калі Ропат быў маладзейшы, ён спрабаваў агрызацца, злаваў, заядаўся з імі. Ён ненавідзеў гэты зброд панурай нянавісцю падманутага селяніна. Яму здавалася, што ўся гэтая нязваная-няпрошаная публіка нахабна і сілком адабрала ў яго вёску — тую, ранейшую, зразумелую, беларускую, поўную дзяўчат, хлопцаў, маленькіх дзяцей, дзе былі песні, каляды, вячоркі, дзе ён, Ропат, пачуваўся не чужынцам, а такім, як усе. Калі-небудзь ён выходзіў на досвітку ці нават уночы і ішоў, ціха ступаючы, па вуліцы, спадзеючыся ў душы на дзіва: а раптам зноў усё вярнулася, стала ранейшым? Не. За выключэннем аднаго дачніка, у якога ўзарваўся кіпячы кацёл з брагаю і ён атрымаў пашкоджанні, «несумяшчальныя з жыццём» (адпяваў поп, хавалі з музыкай, вянкамі — прыгожа), увесь астатні зброд не старэў, не хварэў, не паміраў, не правальваўся пад зямлю, і не зносіла яго ніякім ветрам нячыстая сіла.

Цяпер у Ропата ўжо і на нянавісць не засталося моцы — усё выела праклятая старасць. І калі ён прыходзіў да аўталаўкі, ён ні з кім не вітаўся, нікому нічога не адказваў, ні на кога не пазіраў, стараўся хутчэй, з мінімумам слоў купіць неабходнае і пайсці прэч. Толькі звыкла, застарэла, абыякава думаў:

«Зброд...»

III

Сахалінка пачала жыць у хатцы. Ропат ведаў з размоў каля аўталаўкі, што яна сапраўды прыехала з Сахаліна, там нарадзілася, пражыла ўсё жыццё, ніколі да гэтага не была ў Беларусі, і вось цяпер, на пенсіі, пад старасць, перабралася сюды дажываць.

Кампанейская нават па мерках мясцовага люду, энергічная, яна хутка асвойталася, імгненна перадружылася з такімі ж, як сама. Мо дзён пяць запар спраўлялі ўлазіны. Гасцявалі ў яе Барыс з Раяю і дзед-філолаг, і бацька з сынам Ісаевы... На закуску купілі ў бізнэсмэна в'етнамскага парсюка. Праведаўшы пра Ропата, Сахалінка прыходзіла яго клікаць, стукала ў дзверы. «Дзед-сусед!»

Ропат не адзываўся.

А раніцамі спадцішка са сваёй хованкі, як паляўнічы з засады,назіраў за ёю. З пахмелля яна нудзілася, курыла, суха, моцна кашляла, лаялася на гэты кашаль. Прывыклая да кампаніі, адзінока тулялася па двары, а то проста стаяла на адным месцы і пазірала ўдалячынь. Вочы сінія, глядзяць не з-пад ілба, не панура, як у тутэйшых сялян, што ад нараджэння да старасці бачаць вакол толькі лес, жывуць сярод абмежаванай дрэвамі прасторы, якая сама па сабе прыгнятае чалавека, — не, Сахалінка глядзела адкрыта, свабодна, нібы перад ёй распасціраўся родны акіян, бязмежная сіняя шырыня.

Сочачы за ёю, Ропат бачыў, што для вясковага жыцця яна абсалютна непрыдатная, гаспадыня з яе ніякая, супу яна не зварыць, бо гаршчок да печы не данясе, у лесе за корань зачэпіцца, грыб растопча, ні ягадзіны на кусце не ўбачыць, ні каларадскага жука на бульбоўніку... Нікчэмная, адно слова — «зброд».

Сустракаліся яны толькі каля аўталаўкі, куды Ропат вымушаны быў прыходзіць. І там, калі бачылі іх разам, з'явілася новая тэма, ад няма чаго рабіць узнік такі розыгрыш: маўляў, трэба звесці іх, Ропата і Сахалінку, і пажаніць.

«Ну, Ропатавіч, шчасце табе на старасці падваліла! Рыбы, ікры наясіся! Сахалінскай!»

Сахалінка ахвотна падыгрывала, спрабавала абдымаць яго, хапала пад руку:

«А што? Ён мне падабаецца. Хай бы ўзяў ён мяне, ці я да яго перайшла. Усё весялей. Толькі ж дзікі надта. Хаваецца, маўчыць!»

«Ён і з намі не гаворыць. Няпросты дзед, хітры. Не пускае ў хату нікога».

Здагадлівы дзед-філолаг устаўляў:

— Гордый он, не желает к нам снисходить. Считает ниже своего достоинства.

«Ды дурны ён, а не горды! Не разумее свайго шчасця — такую суседку мець!»

Барыс прыводзіў такі аргумент:

«Усё адно табе, Ропатавіч, хутка паміраць, доўга не працягнеш — дык хоць перад смерцю адвядзі душу, пагуляй!»

Сахалінка заступалася за яго: «Якая гулянка — хоць дагляд будзе, вады шклянку падам, падушку падаб'ю, доктара выклічу... Галоўнае, не адзываецца, — скардзілася яна. — Маўчыць, а я баюся, ці не памёр. Вунь які стары — ніякі ўжо».

І ўся кампанія пачынала ўшчуваць Ропата:

«Ты ж праўда адзывайся, дурны дзед! Хоць голас падавай!»

«Памрэш — і ніхто ведаць не будзе, ты ж адзін!»

«Нам жа цябе хаваць!»

«Нічога, Ропатавіч, мы яшчэ на яго памінках станцуем!» — зубаскаліў Барыс.

Ропат, пакутуючы, хутчэй спяшаўся пайсці ад іх.

Гулялі ў Сахалінкі часта. Відаць, грошы ў яе вяліся, прывезла з сабою і цяпер прагульвала, дабірала тое, чаго не паспела раней. І кожны раз хадзіла клікаць Ропата. Нешта цягнула яе да яго. «Дзед-сусед!» Ён не адзываўся. Ляжаў на сваім жалезным цвёрдым старадаўнім ложку, сам маленькі, ссохлы. У вакне мільгалі



буйныя і дробныя зоркі. Ад Сахалінчынай хаты перыядычна неслася: «камбат бацяня, бацяня камбат!..» Памаўчаць роўна столькі, каб выпіць-закусіць, — і зноў: «камбат бацяня!..»

Раптам неяк само сабой, без усялякай сувязі з песняй і гулямі, падумалася — а сапраўды, і Сахалінка, і ўсе гэтыя людзі, каго ён называе «збродам», хочаш не хочаш, а будуць хаваць яго, больш няма каму. Пахаваюць, прыйдуць сюды, у чужую ім хату, пачнуць хадзіць, мацаць усё. Хто яго пашкадуе, каму якое гора з яго смерці? Памёр Максім — ну і х... з ім. Смяяцца будуць. Разглядваць фотакартку сына, які загінуў маладым, жонкі... Пачнуць памінкі ладзіць, спяваць «камбат бацяня»... А што скажуць на могілках? Ці так, моўчкі закапаюць? Ды і што яны могуць сказаць? Ён сам пра сябе нічога не ведае. Каб яму давялося выступаць на ўласных памінках — ён не змог бы. Яму, яго целу, 77 гадоў, а на самай справе — сем, і ўсё жыццё ён адчуваў сябе сямігадовым.

Кажуць, старыя выдатна памятаюць мінулае і забываюць учарашняе — глупства, адно з тых, якіх ён наслухаўся за жыццё, і некалі верыў гэтаму, думаў, як людзі кажуць, так і ёсць. Нікому не трэба верыць, пакуль на сабе не паспрабуеш. Ён якраз-такі памятае ўсе да аднаго дні апошніх гадоў, а вось з даўняга, з дзяцінства — амаль нічога, толькі агульны план, нейкія асацыяцыі. Пах першага снегу, малады салатавы гурок з жоўтым пупсікам, калючы... Маладыя гуркі калючыя, іх не трэба мыць, дастаткова выцерці аб штаны... Вось і ўсё, бадай.

Можа, і пра смерць хлусяць, што яна страшная? Можа, ніякая яна не страшная? Заснуў ды і заснуў. Якая розніца, хто і што потым будзе рабіць з яго целам. Пах першага снегу ніхто не забярэ, нікуды ён не знікне, і адчуванне калючасці агурка — таксама.

IV

Неўзабаве Сахалінцы пад хатку прывезлі трактар дроў. Ропат, адхінуўшы фіранку, прыціскаючы да шыбіны хрышчаваты нос, марна ўглядаўся, але бачыў толькі свае зараснікі. Тады не вытрымаў, выйшаў на сваё вытаптанае месца. Бацька Ісаеў увішна балгаркаю пілаваў бярвенні, сын Ісаеў, голы да пояса, з гэканнем калоў, Сахалінка адцягвала гатовыя белыя паленцы ўбок. Ропат стаіўшыся, з зайздрасцю пазіраў на талаку.

Для яго самае балючае ў жыцці пытанне, самая вялікая праблема была — дровы. Можна перанесці голад, адзіноту, не есці, не спаць — старому і не хочацца; але холаду ён баяўся вельмі. Эканоміў дровы, падбіраў на дарозе кожную трэсачку. Не столькі цяжкай была іх нарыхтоўка, колькі непрыемныя клопаты: паход у лясніцтва, там прасіць, прыніжацца, «падмазваць» бутэлькамі, потым, калі ўрэшце іх прывозілі, пілавалі, калолі — надыходзіў самы для яго прыкры момант: ладзіць «пачостку», гэта значыць пускаць чужых у хату, частаваць, паіць, пазіраць на іх, гаварыць з імі... Ён, не скупячыся, пераплачваў удвая-ўтрая, але ў хату не запрашаў ніколі. Потым доўга па адным паленцы пераносіў дровы пад паветку, нават кару, нават пілавінне зграбаў. І ўсё адно да вясны не хапала. Здаралася, у халодныя зімы ён сёк свае зараснікі — яны гарэлі добра, толькі шыпелі і пускалі з замерзлых галін пухірыстую ружовую ваду.

А тут — як у іх усё лёгка! Увечары зноў была гулянка, спявалі «камбат-бацяню», прыходзілі зваць Ропата: "Дзед-сусед! — крычала Сахалінка. — Ты жывы хоць?! Ты ж не ўздумай паміраць! Што я без цябе рабіць



буду!» Ён маўчаў. Потым хадзілі, тупалі вакол хаты, шморгалі з усяе сілы дзверы, стукалі ў кожную шыбку. «Адчыні, дзед!» Ён ляжаў, як мумія, не спаў. Толькі пад раніцу супакоілася вакханалія, стала неяк падазрона ціха. Ропат чуў, як пад'язджала машына — адна, і яшчэ адна. І ўдзень каля аўталаўкі, як падышоў туды Ропат, не было ажыўлення.

«Што, Ропатавіч, аўдавеў не жаніўшыся? — сказаў яму Барыс з дакорам: — Няма больш тваёй нявесты!»

Нічога не адбілася на твары Ропата. Пастаяў трохі, паслухаў, даведаўся, што Сахалінка памерла ўночы. Барыс усё абураўся, як гэта так, каб «хуткая» не дапамагла. Лаяў матам дактароў. Толькі і змаглі, што памацалі пульс і забралі ў морг. «Нічога, — пакрыўджана гаварыў Барыс, — ускрыцце пакажа!» І ўсё паўтараў, нібы апраўдваючыся перад кімсьці, нават нібыта пагражаючы камусьці: «Ускрыцце пакажа!»

Ропат пастаяў, паслухаў і падаўся дамоў. Праходзячы каля хаты Сахалінкі, запаволіў хаду. Паляніца свежа-колатых дроў была складзена пад самым яго плотам, акурат насупраць месца яго засады, нібы нябожчыца ведала, што за ёй сочаць, і хацела закрыць паляніцай сектар агляду.

А мо наадварот? — раптам цюкнула яму ў галаву. Мо прадчуваючы, што не перажыве зіму і гэтыя дровы ёй не спатрэбяцца, знарок папрасіла так блізка скласці? Каб яму, яе дзікаватаму дзеду-суседу, лацвей было хадзіць сюды марознай зімою, халоднай парою, карыстацца яе дрывамі і яе дабром успамінаць? Яму ўявілася сцежачка ў снезе, як ён тупае, каб выбраць і прынесці некалькі каштоўных паленцаў...

На наступны дзень каля Сахалінчынай хаты тоўпіўся народ, стаяла машына — казённы чорны бус. Побач — вянок з чорна-чырвонымі стужкамі. З хаты даносілася гудзенне папа. На двары, як заўсёды, залішне мітусіліся Ісаевы, бацька і сын. Рая ў чорным, з заплаканымі вачыма, трымала Барыса пад руку. Барыс быў у касцюме з гальштукам. Спакойны, важны дзед-філолаг зняў капялюш. Прыхіленае да сцяны, чорнае зверху, белае ўсярэдзіне, стаяла века, прыцiснуўшы нізам кусцік хрызантэмаў. Ісаеў-сын заўважыў, адсунуў века, клапатліва пачаў распраўляць пакамечаныя, паламаныя кветкі. Барыс шапнуў Ропату, ківаючы на века: «Да сябе прымяраеш?»


Тут жа на зямлі ляжаў чорны металічны крыж з надпісам на таблічцы: «Ропот Анастасия Владимировна...» Механічна, без усялякіх эмоцый прачытаў Ропат уласнае прозвішча. Ропатаў было мо паўвёскі, і ўсе адно аднаму чужыя, ні ў якой ступені сваяцтва не знаходзіліся. Дзед-філолаг таксама разглядваў надпіс на таблічцы і нешта мармытаў — нібы ва ўнісон папу чытаў адыходную. Ропат прыслухаўся.

— Безобразие, — мармытаў дзед-філолаг. — Откуда эти кастрированные, без окончаний, фамилии? Почему не просто — Ропотова? Или у нас был... я знал — Кропотов... Вот фамилия: сочная, хрустящая и вполне грамматически правильная!..

2014 г.

«ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» | № 2 (102) | 27 лютага 2015 | № 8 (425) Новы час

Сляды часу



Алесь КАМОЦКІ

***

Я ведаю, што там, дзе заўтра будзе дзень,
Учора не знайшлі ні нас, ні нашых думак.
І вечар ціхшынёй у вочы не глядзеў,
І мроя не была ні добрай, ні разумнай.

Браў вецер за руку дзіцячую душу.
Я бачыў — іх сляды глыталі кіламетры.
Тлумачыць кожны крок душу не папрашу –
Няхай сабе ідуць, я давяраю ветру.

Вяртаннем назаўжды не вырашыць праблему,
Памкненню не знайсці ні месца, ні спакою,
Чаканне сапраўды хацела мець не тое,
Чым можа быць жыццё, калі мяняе тэму.

Я ведаю, што ты на заўтра не зважаеш,
Смакуючы фінал; я ж мару пра працяг,
Пра гэту далячынь, што быццам не чужая,
Але і не мая, бо я тут у гасцях.

***

Цёмна-шэрая ноч па халоднай зямлі
Чорным сэнсам і шчырым намёкам
Безліч лёсаў нікчэмных паспела разліць
Пад усмешкамі сонных аблокаў.

І дарогу на захад шукае ўсход,
І спрадвечную песню губляе,
А пасля нерашуча маўчыць ля варот,
За якімі ні пекла, ні рая.

Выпіла песню маю
Далеч бясконцых дарог,
Думкі вялі за парог,
Голас спяваў, покуль мог,
Даўнюю песню маю.

І прыходзіць пара стаць каля алтара,
Скіраваўшы да сонца малітву,
І стаяць, покуль свечы ушчэнт не згараць,
І на прасты працяг не разлічваць.

Ці ж падманеш пачатак чарговага дня,
Перакрыўшы святло занавескай?
Пасівелую ноч бессэнсоўна спыняць,
Бо яе зачакалася вечнасць.

Выпіла песню маю
Далеч бясконцых дарог,
Думкі вялі за парог,
Голас спяваў, покуль мог,
Даўнюю песню маю.

***

Зімовы вечар апускае мне на плечы
Сівы туман раптоўнай снежаньскай адлігі,
А незваротны час знікае непрыкметна
І не зважае на пачуцці і ўздыхі.

Гады лятуць, пакуль гадзін ніхто не лічыць,
І, без увагі пакідаючы хвіліны,
Каму заўгодна я мінулае пазычу,
Каб толькі вырвацца з палону ўспамінаў.

Я буду заўтра забываць сваё ўчора,
Таму, што сёння дзень заняты
іншай справай.
Слядамі часу запаўняецца прастора —
Не будзе крокам болей шляху неўзабаве.

Зімовы вечар апускае мне на плечы
Сівы туман раптоўнай лютаўскай адлігі...

***

Я жыву па-за словамі
Папулярнае мовы —
Зрэшты, справа не новая,
Як і гэтыя словы.
Я жыву, не спяшаюся,
Я жыву як умею,
Каб было ў чым пакаяцца,
Памыляюся ў меру.
І ад рання да вечара,
Да гадзін ад імгненняў
У памкненні да вечнага...

...энтрапія, карацей кажучы.

***

Спякота зверху, спякота знізу,
Навокал ліпень, а ў галаве
Талковай думкі няма паблізу,
А неталковых адна ці дзве.

Спякота зверху, спякота знізу,
Навокал ліпень і вольны дзень,
Цябе так звыкла няма паблізу,
Ды я і сам невядома дзе.

Душы няўтульна у арганізме,
А вочы прагна шукаюць цень,
З дарогі збіўся я не наўмысна —
Ці засынаю, ці звар'яцеў.

Ратуе розум адно імгненне,
Калі, на шчасце ці на бяду,
Твая усмешка выходзіць з ценю,
І я нарэшце за ёй іду.

***

Хацелася слову парушыць маўчанне,
Хацелася небу сачыць за узлётам,
Хацелася скончыцца ўрэшце чаканню.
Хацелася ведаць, адкуль ты і хто ты.

Вясна перастала здавацца вясною,
І здзіўлены позірк блукаў паміж снамі,
А заўтра было недзе там, за табою,
А сёння было недзе тут, перад намі.

Твой дзень, панядзелак, спыніўся у часе,
Што так не бывае, ніхто не заўважыў.
Каб неяк пазбегнуць памылак уласных,
Пытанні знікаюць у нетрах адказаў.

Але панядзелак былыя надзеі
На «ёсць» і «няма» беззваротна падзеліць,
Хоць кожны па-свойму, але разумеем —
Заўсёды бывае не так, як хацелі.

Хацелася слову паслухаць маўчанне,
Хацелася небу паспець за узлётам,
Хацелася крочыць за межы чакання.
Хацелася ведаць, ці будзе субота.

***

Я стаміўся з табой сябраваць,
Выбачацца, чакаць, дараваць,
Разумець, адкладаць, пераносіць...
Да таго ж пачынаецца восень —
Незваротна знікае цяпло.
Падуладны яго недахопу,
Паступова марнее мой клопат
Дбаць пра тое, чаго не было.

***

Ты пафарбавала маё неба
У колеры надзеі і чакання,
Стала невядомае патрэбным,
Згінулі адказы на пытанні.

Навучыўся быць бязважкім вечар,
Каб дадаць спакою у размову...
Восень падыходзіць непрыкметна,
Ды нашто на восень траціць словы?

Раніца, як можа, грэе вецер,
Абудзіце спадзеў мар наіўных.
Час вядзе у восень непрыкметна.
Я ж хачу, каб ён спыніўся ў жніўні.

***


Не пройдзе шлях Ваш там, дзе зараз я
Свае сляды да выхаду рыхтую,
Дзе галава ссівелая мая
Спакою яшчэ доўга не адчуе.

І будзе дом Ваш заўтра на зямлі,
Якую абмінае бездарожжа,
І не са мной Вам спадзевы дзяліць —
Я ўмею толькі складваць альбо множыць.

І будзе лета сілу набіраць,
На драбязу увагі не звяртаючы,
Каб знікнуць у зімовых вечарах
І жыць там, больш нікуды не знікаючы.

Галава на плячы

Перайдзі мой сон уздоўж,
А пасля перайдзі яго ўпоперак,
Не пакінь, як удасца, слядоў
Па-за межамі новага сна.
Калі зможаш паспець да відна,
Забяжы на хвілінку ізноў,
Каб пабачыць, як робяцца попелам
Рэшткі колішніх сноў.



***

Фарбуюць вочы ночы ціхшыню,
Сон не дае жаданага спакою,
Бо, як заўсёды, я не тое сню,
Каб апасля і думаць не пра тое.

Сівее золак звыклага жыцця,
І вочы рання на мяжы з усмешкай,
Напэўна, спадзяюцца на працяг...
Ну, карацей, звані, калі прачнешся:)

***

Паводле «Los Bilbilicos» Psalteria

Вакол спяваюць салаўі,
Каханнем поўняць слых.
Празрыстых гукаў чысціні
Нам хопіць на дваіх.

І кветкі, тоячы уздых,
Цвітуць табе і мне,
Але пакуль належыш ты
Далёкай старане.

Жыццё заблытала шляхі
Вясноваю парой,
Ды веру я — з краёў чужых
Прыедзеш ты за мной.

***

Я казаў табе тысячу слоў
Самых розных, вясёлых і сумных.
Час разгублена ўперад ішоў,
Дні знікалі без лішняга шуму.
Скіраваўшы свой позірк назад,
Я міжволі ўпадаю у скруху,
Бо ні разу табе не сказаў
Аднаго — што люблю цябе слухаць.

***

Паводле «А напоследок я скажу» Б. Ахмадулінай

Апошніх словаў марны шэпт:
Бывай, кахаць ужо не трэба.
Знікае свет,
За ім услед
і цемру забірае неба.
Як ты кахаў?
Ты наклікаў
няясныя
На нашы мары.
Ты так кахаў,
Як уцякаў,
Хаця цябе я не трымала.

Апошніх словаў марны шэпт...

Пачуццям думак не стае,
Пяшчотны сэнс згубілі рукі,
Цябе не бачаць сны мае,
Знікаюць пахі, моўкнуць гукі.

Апошніх словаў марны шэпт:
Бывай, кахаць ужо не трэба.
Знікае свет,
За ім услед
і цемру забірае неба.

Апошніх словаў марны шэпт...

***

Жыццё нам дорыць байкі з казкамі,
Жыццё нам не сябе паказвае.

Жыццё нас зводзіць у кампаніі,
Жыццё разводзіць нас з каханымі,
Жыццё хаваецца за казкамі
І не усім сябе паказвае.

Па-за жыццём памкненні множацца,
Іх простым сэнс належыць кожнаму,
Але звычайна недасяжны,
Бо не усім сябе пакажа.

Ты па жыцці ідзеш, шукаючы,
Па-за жыццём ты усміхаешся.

***

Р. С.

Было не так учора на зямлі —
Другія кветкі у другіх букетах,
Шляхі не тыя не туды вялі,
Мы думалі не тое не пра гэта.

Уражвала і цешыла жыццё,
Здавалася — яно не мае краю,
Галоўная сустрэча з небыццём
Яшчэ далёка, і не нас чакае.

Але не роўны маюць людзі лёс,
Бог бачыць самых лепшых адмыслова,
Бывае, што яны у бок нябёс
Сыходзяць часам несвоечасова.

Мінае час, і нашыя гады
Так непазбежна колькасць набіраюць,
А хтосьці, назаўсёды малады,
З нязнаных даляў моўчкі пазірае.

***

Казалі нам з усіх бакоў:
— Глядзіце — вас не стала,
А мы спявалі пра любоў
Да бульбы і да сала.
Кавалак лепшы для гасцей,
Прынамсі, кожны меў,
Але ж, каб столькі іх было,
Наўрад ці хто хацеў.

Тым, хто казаў, што нас няма,
Мы не маглі паверыць,
А хто ж тады іх сустракаў
І адчыняў ім дзверы?
Хто іх пускаў на свой парог
І частаваў як мог?
Хто ім на карак апасля
Узлезці дапамог?

...

Пакуль сюды буслы лятуць,
Былі і ёсць, і будуць
Заўсёды тут — мой родны кут —
Палі, лясы і людзі.
І што б там хто ні гаварыў,
Мы тутака ўвесь час.
І не настане той пары
Калі не будзе нас.

Пошукі ісціны

Гэтая публікацыя — апошняе з напісанага Лідзіяй Арабей. Яе абразкі, дасланыя ў лютым, па-за ўсялякіх «чэргаў» былі здадзены ў друк. І Лідзія Львоўна, ведаючы аб тым, чакала выхаду гэтага нумара… Аднак 20 лютага — на 90-м годзе жыцця — пісьменніца пакінула наш турботны свет. І назаўсёды застаецца ў Беларусі. Вечная памяць!



Лідзія АРАБЕЙ

Слова

Згубілася слова, такое простае, такое знаёмае, амаль кожны дзень яго ўжывала. Заблыталася недзе ў звілінах і знікла. Пакутуеш, яго ўспамінаючы, і ніяк не ўспомніш. І раптам, можа, праз гадзіну, а можа, праз некалькі дзён, яно само выплывае, быццам і не знікала, і дзівішся, як гэта я не магла яго ўспомніць.

Стол

У мяне ёсць складны стол. Ім карыстаюцца многія суседзі з нашага пад'езда. Але раней яны бралі мой стол, калі ў іх збіраліся госці на дні нараджэння альбо на якое свята, а цяпер часцей за ўсё бяруць на трызну, на памінкі.

Багацеі

Цяпер самыя багатыя ў нас людзі — пенсіянеры. Яны рэгулярна атрымліваюць свае пенсіі, ні на якія гульбішчы не ходзяць, і таму не купляюць сабе новых строяў, даношваюць старыя. Яны мала ядуць і мала трацяць на харчы. У іх яшчэ застаюцца грошы, каб дапамагаць сваім дзецям і ўнукам, якія з нецярпеннем чакаюць бабчынай мізэрнай пенсіі.

Цана зямлі

Некалі сусед гатовы быў забіць суседа, калі той, праводзячы мяжу, адхапіў хоць лапік ягонай зямлі. Зямля цанілася, як золата.

Цяпер вялікія абшары ў Беларусі пустуюць не засеяныя. І дачнікі, атрымаўшы ў сваё карыстанне некалькі сотак, не лічаць патрэбным выкарыстоўваць іх пад гароды. Дачы, маўляў, для адпачынку, а не для працы. Зямля ўпала ў цане, усё часцей натуральныя прадукты замяняюцца хіміяй, і невядома, як гэта адгукнецца на здароўі наступных пакаленняў.

Цывілізацыя

Цывілізацыя не робіць чалавека лепшым. Яна замяняе яго рукі машынамі, мазгі лічыльнікамі, але выхалошчвае душу. Перавага аддаецца практыцызму, наперад выступаюць выгада, карысць, і мы ўспамінаем эпоху Пушкіна, калі цвілі ўсе музы, калі мужчыны, сустракаючыся, здымалі капелюшы і цалавалі дамам ручкі, тое дзевятнаццатае стагоддзе, якое сёння лічыцца залатым!

Кот

Мая сяброўка завяла ката. Прывезла яго з вёскі, дзе адпачывала летам. У вёсцы яны з катом нібы сябравалі, кот прыходзіў да яе ў госці, сяброўка частавала яго прысмакамі, кот еў, аблізваўся, а потым адыходзіў, падняўшы хвост трубой.

Ад'язджаючы ў горад, сяброўка вырашыла ўзяць ката з сабою, не захацела разлучацца.

Той абышоў кватэру, абнюхаў усе вуглы і крыкам выказаў пратэст супраць свайго пражывання. Кватэра яму яўна не спадабалася. Ён крычаў кожную ноч, не даючы спаць гаспадыні, а калі тая падыходзіла да дзвярэй, ён шчаміўся ў шчыліну, рваўся на вуліцу. І не дзіва: у вёсцы ён лавіў мышэй, лазіў па дрэвах, бегаў да кошачак, а тут турма, не інакш.

Я сказала сяброўцы:

— Калі ён так рвецца на вуліцу, адчыні яму дзверы, і няхай ён бяжыць, куды хоча.

— Ты што! — зазлавалася на мяне сяброўка. — Ён жа тут, у горадзе, прападзе. Будзе лазіць па памыйніцах, набярэцца блох, — не, я яго не выкіну.

І калі ў чарговы раз гаспадыня не выпусціла ката за дзверы, ён моцна, да крыві, укусіў яе за нагу.

Цяпер ужо мая сяброўка баялася ката. Калі ён так моцна грызануў яе за нагу, то можа і яшчэ раз грызануць, не толькі за лытку.

Выхад быў адзін: завезці ката назад у вёску. Але ці блізкі свет — сто шэсцьдзясят кіламетраў?

Сяброўка не пашкадавала грошай, заплаціла знаёмаму хлопцу за бензін, і той павёз ката. Усю дарогу кот крычаў, мусіць, думаў, што яго вязуць у новую турму. Але калі ў вёсцы яго выпусцілі з машыны, ён так узрадаваўся і даў такога стрыкача, што хутка і след яго прастыў.

Такі вось быў вольналюбівы кот.

Хочам буры!

Яшчэ нядаўна, на маёй памяці, шумеў, бурліў Саюз пісьменнікаў, адбываліся сходы, на якіх гаварылася пра літаратуру, абмяркоўваліся новыя творы. Памятаю, як на адным са сходаў, калі падняўся Іван Мележ, каб сказаць сваё слова, пісьменнікі сустрэлі яго воплескамі. Нядаўна быў надрукаваны раман Мележа «Людзі на балоце», і зала вітала аўтара з творчым поспехам. Працавалі секцыі паэзіі, прозы, драматургіі, крытыкі.

Цяпер — цішыня, штыль… Кожны пісьменнік жыве сам па сабе. І хочацца крыкнуць на ўвесь голас:

— Хочам буры!

Пакаранне

Дзяўчына нарадзіла дзіця і пакінула яго на марозе. Дзіця загінула. Матку знайшлі, арыштавалі, далі пяць гадоў. Але што ёй тыя гады. Яна сама сябе прыгаварыла да пажыццёвага пакарання.

А недзе жывуць, не ведаючы клопатаў, тыя, што давялі дзяўчыну да такога граху.

Барацьба

Убачыўшы, што свет недасканалы, колькі ў ім несправядлівасці, рамантыкі бяруцца свет палепшыць: наладжваюць рэформы, робяць рэвалюцыі, пішуць кнігі, заклікаюць людзей рабіць дабро, змагацца са злом і вераць, што свет можна палепшыць. А пад старасць яны бачаць, што ўсе іх патугі аказаліся марнымі. Што свет — які быў, такім і застаўся, што па-ранейшаму змагаюцца дабро са злом, і ніколі дабру не ўдаецца атрымаць перамогу.

Чаму не па-беларуску?

Кажуць, вялікім попытам карыстаюцца беларускія малочныя тавары, якія называюцца «Бабушкина крынка». Але дзе вы чулі ў Беларусі, каб малочныя вырабы называліся «Бабушкина крынка»? Няўжо для беларускага тавару нельга прыдумаць беларускую назву?

Калі захачу

Лукашэнка з тэлеэкрана на ўсю рэспубліку аб'явіў:

— Няхай супроць мяне ўвесь свет паўстане, але калі я захачу быць прэзідэнтам, то буду прэзідэнтам!

І гэтымі словамі сам пацвердзіў, што няма ў нас ніякіх выбараў, і народ нічога не вырашае, а як захоча Лукашэнка, так і будзе.

Сцеражыцеся

Не пускайце ў хату фальшывых сяброўак, яны будуць есці ваш хлеб, піць ваша віно, а потым зробяць вам такую подласць, да якой і страшны вораг не дадумаецца.

Віншаванні

Напярэдадні дня нараджэння мужа жонка абзваньвала знаёмых і, між іншым, гаварыла:

— Не забудзьцеся, што ў Валодзі дваццатага дзень нараджэння. Пазваніце яму і павіншуйце, яму будзе вельмі прыемна.

І людзі званілі, віншавалі, і таму Валодзю сапраўды было вельмі прыемна, што столькі людзей памятаюць пра яго дзень нараджэння і віншуюць.

Наша медыцына

Хварэю. Званю, каб выклікаць на дом доктара. У мяне пытаюць:

— Што з вамі?

— Мне кепска, — адказваю.

— А колькі вам гадоў?

Адказваю.

— І вы хочаце, каб вам было добра?

Прыходзіць доктар.

— Што з вамі? — пытаецца.

— Мне кепска, — адказваю.

— А каму цяпер добра? — кажа доктар. Выпісвае рэцэпт, лякарства па якім каштуе шалёных грошай, і нічога не памагае.

На курорт

У бальніцу паступіла новая хворая — пажылая тоўстая кабета. Першы раз выйшла ў калідор у шыкоўным шоўкавым халаце. Потым кожны дзень мяняла касцюмы і сукенкі. Прыехала ў бальніцу, як на курорт. Наўрад ці ў яе што балела, хаця дактары круціліся вакол яе з ранку да вечара. Не інакш, як матка альбо цешча якога высокага чыноўніка.

Арыштуйце мяне…

У час вайны яна была ў падпольнай арганізацыі. Немцы арганізацыю разагналі, а яе пасадзілі ў турму, потым вывезлі ў Францыю ў канцлагер.

Калі скончылася вайна і вязні лагера атрымалі свабоду, яна вярнулася ў Беларусь, скончыла філфак універсітэта. А потым яе нікуды не бралі на работу. Варта было напісаць, што яна ў час вайны была ў Францыі, у канцэнтрацыйным лагеры… Яна, у адчаі, прыйшла ў КГБ і сказала:

— Арыштуйце мяне!

— За што? — спыталіся ў яе.

— Я сядзела ў фашысцкім канцлагеры, і цяпер мне не вераць, не бяруць на працу.

Невядома, хто ёй паспагадаў, але яе ўзялі стылістам у маладзёжную газету, і яна там адпрацавала да пенсіі.

Наперадзе

Нарадзілася дзяўчынка — маленькі цёплы камячок. Зусім бездапаможнае стварэнне. І трэба ж — вырасла ў прыгожую разумную жанчыну. І стала апораю старому бацьку: што б ён і рабіў без яе — удавец, пасля інсульту.

Ніхто не ведае, што чакае кожнага з нас наперадзе.

Завадатар

Дзіву даемся, як пасля такой вайны, калі праліта было столькі крыві, калі пакалечана было столькі чалавечых цел і душ, магла ўсчацца ва Украіне такая бойня? Які новы напалеончык захацеў славы? Бо войны самі па сабе не ўзнікаюць. Заўсёды ёсць завадатар, які вядзе за сабою, як баран, авечак, на бойню.

Не, чалавецтва за вякі не паразумнела і ніякая навука не ідзе яму на карысць.

Крывадушша

Ці магла прадбачыць я, былая піянерка, былая камсамолка, якая выхоўвалася ў перакананні, што рэлігія — дурман для народа, што царква — перажытак мінулага, што вера ў бога — ад непісьменнасці народа, ад яго цемнаты… А праз некалькі гадоў тыя самыя людзі, што выхоўвалі мяне як свядомую атэістку, праз тэлебачанне будуць паказваць царкоўныя службы, хрэсныя ходы, і вялікае начальства, учарашнія атэісты, будуць цалаваць абразы, хрысціцца і абдымацца са святарамі. Мне робіцца моташна ад такога крывадушша.

Нацыя і людзі

Кожная нацыя мае сваю асаблівасць. Але няма кепскіх нацый, ёсць кепскія людзі. У так званай «талерантнай» Беларусі ёсць такія нягоднікі, такія мярзотнікі, якіх свет не бачыў. Я з імі сутыкалася і магу гэта сцвярджаць з усёй адказнасцю.

Аб'ядала парсюка

Калі я была студэнткаю, то пакуль мне далі месца ў інтэрнаце — здымала ложак у бабулі. Гаспадыня бачыла, што я бываю галодная, днямі нічога не еўшы, і яна, калі варыла бульбу парсюку, часам выбірала з чыгуна пару бульбін і прыносіла мне. Я з'ядала. Аб'ядала парсюка.

Будзе позна

Я больш ніколі не ўбачу мора. Я больш ніколі не ўбачу егіпецкіх пірамід, не ўбачу Рыма, Парыжа. Мае гады і хваробы не дазволяць мне яшчэ раз зрабіць такое цікавае падарожжа. Я мушу дажываць з тым багажом, які ўжо набыла ў мінулыя гады.

Людзі! Старайцеся браць ад жыцця ўсё, што можна, бо потым будзе позна!

Вар'яцтва

Часам мне здаецца, што людзі звар'яцелі. Вайна ў мірны час. Страляюць аўтаматы, узрываюцца бомбы, снарады. Толькі і чуеш: тэрарыстычны акт, заложнікі, загінулі людзі. І гэта ў дваццаць першым стагоддзі. За вякі не набраліся людзі розуму. Ці мала і так усмактала зямля крыві чалавечай?

Хто вораг, хто свой — усё пераблыталася.

Патрыятызм

Улада заўсёды выхоўвала ў свайго народа патрыятызм, каб у выпадку якой навалы народ бараніў сваю зямлю. Аднак улада, мусібыць, не столькі клапоціцца пра сваю зямлю, колькі пра сваю ўладу над гэтай зямлёй: каб навала не скінула яе з наседжанага месца і не захапіла трон.

І вось народ нібыта бароніць сваю зямлю, а насамрэч бароніць уладу.

Ідэя

У час абстрэлу Данецка васьмігадоваму хлопчыку адарвала абедзве нагі і руку. Цяпер дактары змагаюцца за яго жыццё, хоць, па-мойму, было б больш гуманна гэтага не рабіць.

Ці варта хоць якая ідэя такой ахвяры?

Чалавецтва, ты за вякі не паразумнела.

Ратунак

У бальнічнай палаце хворыя бабулькі сядзяць на ложках і нешта чытаюць, чытаюць…

Прыгледзелася — малітвы. Бабулькі чакаюць ратунку не ад дактароў — ад Бога.

Развітанне

Некалькі гадоў шукала ісціну — на вуліцах, у хатах, у чалавечых душах.

А ўласна — што такое ісціна? Па-мойму, ісціна — гэта праўда. І я прыйшла да вываду, што ў кожнага свая праўда, свая ісціна.

Дык і жывіце кожны па сваёй праўдзе, толькі не рабіце адзін другому зла.

Бывайце здаровы!

Быць жанчынай

Палітыка, царкоўныя справы ды спрэчкі, часам — размовы пра літаратуру, згадкі пра падзеі мінулага: партызанку, Слуцкае паўстанне, вайну...

Гэта тэмы, якія пераважна закраналіся ў лістах моцнай паловы беларускай эміграцыі. Пра што ж пісала, што абмяркоўвала лепшая палова?

Ці таму, што архівы збіралі і перахоўвалі мужчыны, ці таму, што жанчыны значна менш выдаткоўвалі часу на карэспандэнцыю, ці з якой іншай прычыны, але лістоў жанчын-эмігрантак захавалася значна меней. Багатыя эпісталярыі пакінулі хіба што актыўныя грамадскія дзеячкі і творцы-навукоўцы. Наталля Арсеннева, Яніна Каханоўская, Раіса Жук-Грышкевіч — гэтымі імёнамі, бадай, можна вычарпаць значную частку захаванага жаночага эміграцыйнага эпісталярыю.

Але ж быць беларускай жанчынай на эміграцыі — гэта не толькі ладзіць выставы ці іншыя нацыянальныя мерапрыемствы ды пісаць вершы. Як і на радзіме, апынуўшыся на берагах Сены ці Гудзону, жанчыны найперш выконвалі традыцыйныя ролі маці, жонкі, гаспадыні. Як ім жылося? Пра што думалася? Што наогул значыла быць жанчынай-беларускай на эміграцыі?

Жонка Прэзідэнта БНР Міколы Абрамчыка (1903—1970) Ніна (у дзявоцтве Ляўковіч) вядомая на эміграцыі тым, што не аддала пасля смерці мужа архіў Рады, зрабіўшы яго таямніцай для сучаснікаў ды нашчадкаў, і абарвала амаль усе сувязі з суродзічамі. Аднак да таго яна даволі сціпла выконвала функцыі «першай ледзі», аддаючы ўвесь свой час хатняй гаспадарцы ў прыгарадзе Парыжа і сыну.

Адной з нешматлікіх карэспандэнтак Ніны Абрамчык (1916—2003) была Вольга Запруднік (1928—1987) — жонка тагачаснага супрацоўніка Радыё «Вызваленне» ў Мюнхене, актыўнага беларускага дзеяча Янкі Запрудніка. У архіве апошняга захавалася некалькі лістоў «першай ледзі» з далёкага 1956-га. Ніне тады было каля 40 гадоў, і ў сям'і Абрамчыкаў, што пабраліся яшчэ ў часе вайны, нядаўна нарадзіўся доўгачаканы сын Альгерд. Больш як на дзесяць гадоў маладзейшая выпускніца Лювэнскага ўніверсітэта Вольга Запруднік мела хіба два гады сужэнскага стажу і якраз нарадзіла дачку. З'яўленне дзяцей, аднолькавыя мацярынскія клопаты, відавочна, зблізілі дзвюх жанчын:

«10.2.56 г.
Даражэнькая Олечка,
даўно ўжо зьбіралася Табе напісаць, але неяк апошне ў мяне з гэтым ідзе туга. Віншую з найбольшай пацехай, маю надзею, што ўжо шмат яна падрасла, падужэла, і маеш меней клопату ды прывыкла меней-болей ходацца, дык мо палягчэла. Я тако-ж маю «пацеху». Мой хлопчык ужо «вялікі» — сядзіць, кажа «тата» і мае 1 зуб. Спачатку трошкі плакаў, але вельмі рэдка, цяпер зусім спакойна гуляе з цацкамі. Ноччу ён ніколі не пабудзіў, сьпіць да раніцы, і час-ад-часу абое прасыпаем «сьнеданьне». Як-жа-ж Ты чуешся, Олечка, як Табе прайшлі гэтыя пэртурбацыі? Я хоць пакрычала і памучылася, але ня надта доўга, усяго 8 гадзін, але мела яшчэ розныя болі (яечнікі, спаросты на мейсцы сьляпой кішкі, сьпіна і г.д. 3 дні). Цяпер я чуюся вельмі змучанай, так што ледзь-ледзь даю рады збольшага ўправіцца. Усю пору памагае мне Мікола. Але цяпер ужо шмат лягчэй, маю надзею, што летам дайду да толку з сіламі.

Напішы, Олечка, пра сваю сямейку, знаёмых і г. д. Там Вас цяпер вялікая кампанія.

Пасылаю тваёй малой пару рэчаў, зь якіх мой ужо вырас. Наздавалі мне тут суседкі кашулек, што дагэтуль яшчэ і не шыла, але вось ужо думаю пачынаць, бо тыя ўжо малыя.

Затым, Олечка, усяго Вам найлепшага і прывітаньні, а Цябе цалую моцна.

Твая Ніна».



Наталля Гардзіенка і Альгерд Абрамчык. Парыж, 2012 г.

Лісты адлюстроўваюць свет жанчыны-беларускі з ваколіцаў Парыжу сярэдзіны 1950-х, такі зразумелы і блізкі, нягледзячы на адлегласць у прасторы і часе...

Ніна Абрамчык амаль не мела сяброўак у блізкай адлегласці. У тагачаснай Францыі можна было знайсці беларусаў, але яны былі раскіданыя па рэгіёнах. У самім Парыжы лік ішоў мо на колькі дзясяткаў, быў Беларускі дом — кватэрка на Rue des Gravilliers, што выкарыстоўвалася як арганізацыйны офіс, ладзіліся багаслужбы айцом Львом Гарошкам... Але ж Абрамчыкі жылі па-за горадам, у Вільпэнце. І калі раней «першая ледзі» магла лягчэй выбірацца на мерапрыемствы суродзічаў, часам нават з мужам па-за Францыю, то пасля нараджэння сына яе свет звузіўся.

Мацярынскія абавязкі сталі на першае месца. Але ж адукаванай жанчыне (за плячыма навучанне ў Віленскім універсітэце) трэба было і яшчэ нешта, каб «заняць галаву». Некалі яна пісала апавяданні пад псеўданімам Ніна Раса, друкавалася ў эміграцыйных перыёдыках. Было, што нават сама паспрабавала выдаваць газету для жанчын — «Беларуска», але далей за першы выпуск справа не пайшла. Традыцыйны жаночы занятак, вельмі пашыраны на эміграцыі, — вышыванне. Ніна Абрамчык збірала схемы ды рабіла вышыванкі, але шукала для сябе і нечага іншага:

«27.7.56 г.
Даражэнькая Олечка,
даўно абяцаны «даўжэзны» ліст зьбіраецца ў дарогу. Зараўды, зь лістамі ў мяне проста скандальная рэч, неяк не зьбяруся ўзяцца за пяро...

Як-жа ж, Олечка, маешся? Ці набрала трошкі энэргіі і пахудзела (я трошкі худзею, бо пасьля родаў асталася тоўстай, як бочка, цяжка было павярнуцца, кажучь, таму й рухлівасьці не было). Аднак чуюся заўсёды вельмі змучанай, хоць амаль нічога не раблю. Працую, праўда, зранку да вечара, але гэта неяк ідзе вельмі павольна, адно пачынаю, ня скончу, бо ўжо трэба рабіць штось другое, тое тако-ж не канчаецца, і вось так, як ланцуг, цягнецца, а ў выніку вечарам балаган усюды, і я прытомленая настолькі, што ледзь-ледзь да ложка дабрыду, каб «адпачыць» некалькі гадзін, а раніцай устаю змучанай, як-бы ўжо поўдня працавала. Чаму гэта так, мне проста дзіўна. Маю-ж сонца, паветра, харчы і ня шмат працы, толькі хатняя, агарод і пару жывёлін (сабака, 20 курэй, столькі-ж крolікаў). Хлопчык мой спакойны, сьпіць добра, вось зьбліжаецца 8 гадзіна, а ён яшчэ сьпіць, таму села пісаць, заўсёды мыю ў гэту пару, каб удзень пасохла. <...>

А як-жа Твая «Прынцэска» з вагой? Ды наогул — ужо, мусіць, вялікі прагрэс ад таго лісту апошняга і фота.

Але-ж і заядлая зь Цябе манархістка! Няўжо Ты верыш у манархію на Беларусі? Мне неяк гэта ніколі не прыйшло на думку.

Радзівілы, Сапегі, Мірскія... Адзін з Мірскіх (ходзяць чуткі) мые талеркі ў Лёнданскім рэстаране. Радзівіл дык прымасьціўся быў амбасадарам «Polski Najnowszej» у Лёндане, пакуль Бэрут «не снял с работы». Дзе ён цяпер?

А чым ты, Олечка, займаешся, апрача «гаспадаркі»? Я — нічым! Проста жаль, што жыцьцё праходзіць міма, «у сваёй хаце»! Так шмат хацелася зрабіць, і вось гультайства апанавала, бо што-ж іншае? На'т не вышываю ўжо — «няма часу» — проста і пісаць сорамна, бо прыказкі кажуць: хто хоча, то і час мае; не шукай часу, шукай ахвоту; час з ахвотаю жэніцца. Устрымаюся на гэтых.

А ведаеш, маю цудоўныя ўзоры. Мой Найдаражэйшы мне «зафундаваў» — «Беларускія Узоры» — альбом, выдадзены ў Менску нядаўна. Але, напэўна, Ты яго тако-ж маеш, калі не, Олечка, прыцісьні свайго Найдаражэйшага, хай Табе падарак на нейкую там гадаўшчыну, «на першы зуб» (мусіць ужо мае шмат зубоў Твая «Прынцэска» — у Аліка 7). Тут ёсьць у французаў звычай, што матка атрымоўвае ад бацькі падарак, калі дзіцё мае 1-шы зуб. Наогул, у іх шмат аказыяў на падарункі! Дык вось, вяртаючыся да альбому: абавязкова яго расстарайся, калі ня маеш. У Цябе-ж вышывальніца расьце (між іншым, Альгерд любіць вышыванкі і ніткі, таму шчэ пры ім не магу вышываць, бо адбірае). Ведаеш, Олечка, што я раблю апрача «гаспадаркі»? «Праекты» — проста сорамна, што забаўкамі займаюся. Нікому не кажу, але вось Табе неяк сарвалася зь пяра, дык ужо напішу.

«Прап'ём да будучыні трэйцяй» — казаў Купала. Так вось і ў мяне, усю пору — гэта будучыня! Тое, што прайшло — мы знаем, гэта як прачытаная кніга, цікавая, зь якой трэба ўзяць высновак: «як ня трэба рабіць блага».

Цяперашнясьць для мяне — гэта зранку да вечара таўкатня, бесталковіца, час, які марна прападае, якога шкада, нявыкарыстаны, якога не нагнаць, змарнаваная частка жыцьця. Будучыня — адзіная пацеха і надзея. Вось таму і раблю «пляны» на будучыню, хоць ведаю, што яны ніколі не прыдадуцца, такія бесталковыя пляны. Вось ужо «распрацавала» ваколіцы, якія знаю, пляны хатаў (захоўваючы нашую цудоўную вёску), яе структуру, якой падобнай ніхто ў сьвеце ня мае. Пляны вуліц, паркаў, дамоў адпачынку, дзе летам «адпачывалі-б» усе таты-мамы-дзеці з гораду, каб дыхаць сонцам і паветрам бяз пылу, а зімой дзядулі-бабулі, каб не задыхацца на печы, а мець сьвежыя пакоі з цэнтральным аграваньнем і ўсім камфортам, які маецца на Зямлі, прынамся тэлевізія, тэлефон ды ванна з добрым мылам.

Бачыш, як гэта з праектам, ці трэйці аркуш паперы хопіць (а Альгерд усё сьпіць, ужо недалёка 9 гадзіна, мусіць, і яму сьняцца праекты, а мо з Татам гуляе?).

Нат ужо горача, сонца прыпякае, цяпер у нас сьпякота, але я ў сваім гародзе маю цень і шмат травы, дык цэлы дзень у купальным касьцюме бадзяюся, аж суседкі завідуюць, што мне добра, бо яны носяць даўгія спадніцы, панчохі і высокія абцасы, а я на траве босая. Скіньце, кажу, і Вам будзе лёгка.

Цікава табе мае праекты, пісаць яшчэ, ці мо' хопіць, каб не занудзіць? Ведаеш, адзін быў вельмі арыгінальным, што на'т Ніколку падабаўся, і прапанаваў падаць яго ў прэсу як дыскутны, але аб ім пісаць ня буду, гэта доўга, ды, пэўне, і нудна...»

Праекты добраўпарадкавання мястэчка, напэўна, былі часовым хобі. Нідзе пра іх ніхто болей не згадваў. Ніна Абрамчык жыла найперш для сына і мужа. Першы даваў стымул для творчасці. Дзякуючы апошняму жанчына была добра абазнаная ў розных падзеях жыцця беларускай эміграцыі і знаёмая шмат з якімі дзеячамі, у ацэнках якіх часта аказвалася даволі катэгарычнай.

«...Прыязджалі тут Грышкевічы. Страшнае ўражаньне, проста кашмарнае на мяне зрабіла Раіса. Зусім яна не зьмянілася, асталася той самай Раісай Жукоўскай, мяшчанкай Пружанскай Горкі, не памаглі ёй на'т яе 2 дыплёмы. Шкада мне яе вельмі. На ўсіх злосная-злосная, паводле яе ўсе і ўсё — «нічога ня вартае сьмяцьцё». Яна сказала: «Беларускі Народ — гэта няздарная жаба, якая нягодная жыць» і што ёй сорамна, што яна належала да гэтага народу... За такія рэчы — павесіць мала. Ну, што-ж, «хай з дарогі, хто слаб, адыходзе», казаў Танк».

Кожнаму, хто чуў імя Раісы Жук-Грышкевіч (1919—2009), сябры Прэзідыуму Рады БНР, кіраўніцы Каардынацыйнага камітэту беларусаў Канады, адной з найбольш актыўных грамадскіх дзеячак на эміграцыі, цяжка даць веры гэткай характарыстыцы. Магчымую прычыну такога негатыўнага водгуку падказаў Янка Запруднік. Як аказалася, некалі сястра Раісы Валянціна Жукоўская (у замустве Пашкевіч) была суперніцай Ніны ў барацьбе за сэрца Міколы Абрамчыка. Напэўна, гэта магло паўплываць і на пачатковае стаўленне да самой Раісы, з якой пазней тая ж Ніна даволі актыўна ліставалася.

«7.9.56
Даражэнькая Олечка,
пачынаецца ў нас сэзон сонца і вінаграду! Бяры сваю «Прынцэску» і прыяжджай! не чакай, пакуль Найдаражэйшы папоўніць касу. Каса — гэта такое нешта, што мае ў дне дзюрку, празь якую ашчаднасьці недзе выпадаюць. <...>

Там у Вас ужо сьнег падаў, а мы ўсё яшчэ спадзяёмся прыгожай пагоды. Лета было мокрае і на'т ня надта гарачае, але восені тут зазвычай бываюць вельмі прыгожыя, даўгія, сонечныя, праўдзівае лета, вельмі прыемнае, негарачае.

Ці бачышся часамі з маім Брацікам? Усё неяк па Нямеччыне блукаецца адзінокі. У гэтым годзе на'т ня змог сюды заглянуць да нас. Пакутуе ён у мяне, Браток.

Раіса як паехала, дык ані слова не напісала. <...>

Олечка, прыяжджай, пішы, дзякую за фота.

Цалую, Ніна».

Гэта быў, відаць, апошні ліст, напісаны ў Мюнхен. У наступным 1957 г. сям'я Запруднікаў пераехала ў ЗША. За новымі клопатамі ліставанне паміж жанчынамі перарвалася — і невядома, ці аднавілася наогул. Прынамсі, іншых лістоў не захавалася. А гэтыя... Так, у іх няма літаратуразнаўчых дыскусіяў, успамінаў пра гістарычныя падзеі, царкоўных спрэчак... Затое гэтыя лісты адлюстроўваюць свет жанчыны-беларускі з ваколіцаў Парыжу сярэдзіны 1950-х, такі зразумелы і блізкі, нягледзячы на адлегласць у прасторы і часе...

Наталля Гардзіенка

«Хадзем са мной»

Сяржук Сыс. ПАВУК: вершы. — Мінск: Галіяфы, 2014, — 98 с.



Разглядаючы другую кнігу Сержука Сыса «Павук», займеў пачуццё незадаволенасці, таму і пачну адразу савою аб пень ці пнём аб саву.

Ведаю, што вынік будзе аднолькавы: саве — балюча. Кнігі — няма. У сэнсе, што кніга ёсць і ў той жа час кнігі няма. Ёсць спроба, паставіўшы пад вершамі даты, скіраваць чытача на тое, што на старонках адбываецца сталенне паэта ці эвалюцыя ад амаль класічных радкоў да шчырага постмадэрну. І гэта лічу вялікай няўдачай. Патлумачу праз вобраз павука, які апантаны ідэяй павуціння. Як толькі павук робіцца павуком, ён пачынае сваю працу ткача, і кожны ягоны выраб уражвае сваёй дасканаласцю. Як называецца: пачаў і скончыў. Што тут сказаць? Назва няўдалая, бо не выконвае сваёй непасрэднай функцыі раскрыцця зместу. Але не хачу больш пра кепскае, бо Сяржук Сыс ёсць маім сябрам, а крыўдзіць сяброў — гэта не зусім па-беларуску, хаця, здаецца, якраз па-беларуску.

Ergo, цяпер пра тое, што палюбляю. Неаспрэчнай удачай кніжкі ёсць паэтава фота, хоць і пастановачнае, але вельмі ўжо мастацкае. Аўтар яго ў кнізе, на жаль, не ўказаны. Але на нас пазірае твар злодзея, які ўжо нешта скраў ці яшчэ збіраецца штосьці скрасці, тут, на млыне: крупы, муку, мяхі, коней, але для паэта: словы, вобразы, рыфмы, пачуцці. І для паэта гэта добра, скрасці і засвойтаць. А зловяць, дык засмяяцца фраерскім вершам, да прыкладу, такім, як «Уварванне ў жабін рай», які, бясспрэчна, назаву адной з галоўных удачаў гэтай кнігі. Вось ён, высёла-звонкі голас беларускага балота, з пахам глеістай твані і смакам свежа-белага аеру. А верш «Вып'ем з Месяцам віна» проста конгеніяльны, чытаеш яго, і нібыта ўваскрасае Роберт Бёрнс з ясным пафасным адчаем невынішчальнага аптымізму:

Трэснуў лёс, нібы начоўкі:
Я — адзін, яна — адна...
Заўтра месяц прыйдзе
зноўку,
Вып'ем з месяцам віна.

Халера, гэта не Бёрнс, а Сыс, але таксама хораша.

Не магу суняцца, назваў бы кніжку «Хадзем са мной» — і было б добра. І пытанняў не было б. Маўляў, гэта ўсяго толькі падарожжа ва ўнутраны свет, у Краіну Паэта, і выбачайце, калі ласка, калі мая краіна вам не даспадобы. Іншай у мяне для вас няма. А мая, у сэнсе, Сысава, уся засаджаная дрэвамі: дубы, грушы, яблыні з паспелым антонам, сівыя лозы, а пад імі кветкі: улюбёныя ляўконіі, букеты з восеньскага лісця, але самыя зваблівыя для Паэта з кветак — дзяўчаты. Яны для Сыса невычарпальнае радавішча радасці і болю, а і тое і тое служыць натхненню верна. І верш, які просіцца на музыку, каб стаць рамансам, «За тое, што ты ціха памірала...»

Цытата з Ісаіі для мяне тут залішняя. Хіба Сяржук Сыс яе прыляпіў, каб чытач змог параўнаць, хто тут круцейшы, але, зразумела, што Ісайя, хаця мо хто і паспрачаецца. На густ і колер сп'янелы жук гусю не таварыш, хаця лётаюць абодва.

У савецкія часы да дэфіцытных тавараў, такіх як зялёны гарох, давалі так званую нагрузку, звычайна іржавы селядзец. Такой нагрузкай я лічу раздзелы «Апостраф» і «Чужыя гарады», хаця ў раздзеле «Апостраф» ёсць паэтычныя ўдачы: уласна сам «Апостраф», вершы «За вячэрай», «Навучы мяне не заўважаць», «Мама, як мне баліць». Не, выбачаюся, з раздзелам «Апостраф» я, мусіць, перабраў. Гэты раздзел вельмі арганічны, і вершы ў ім дарobленыя на ўзроўні вершаў. Вось яна, уся паэзія, тут, у студэнцкім парку, на могілках, вымагае трызны і трызнення.

Зразумела, што не магу не адзначыць верш, які, нібы цыган, вандруе ўжо з кнігі ў кнігу: «Ноч, павуцінне сноў...» Сяржук Сыс лічыць яго шэдэўральным і, мусіць, не толькі Сыс, і, мусіць, лічыць яго вербалізацыяй удалага фота. А я паставіў бы верш са «Стрэмкі» «Паміж Гомелем і Мінскам», верш сапраўды шэдэўральны, на маю думку, і фота дапасоўвался да яго куды як не горай. Ды што зроблена, тое зроблена.

Але Сяржук Сыс не быў бы Паэтам, каб не ўмеў бязлітасна і люта пашкадаваць сябе. І не думайце, што гэта парадокс, гэта ўсяго толькі верш «Бацькавыя гусі».

ловіць татка плотак на
Дняпры
варыць мама сціплую вячэру
цягнуць гусі тату з-пад
гары
мама азіраецца на дзверы...

Вось дзе яна, анталагічная глыбіня, вось ён тут на роўні з Іёвам і Эклезіястам. Болесна, цяжка і невыпраўна, бо адвечна ад нараджэння да скону і ад скону да нараджэння. А гэта ўжо доля Сысава Нашая Беларуская.

Даруй мне ўжо, братка, я тут пра цябе рознага папанапісваў.

Сяргей Вераціла

Незвычайная энцыклапедыя для дзяцей

Вершаваная энцыклапедыя жывёльнага свету / уклад., аўт. канцэпцыі, тэксту Аксана Спрынчан; іл. Веранікі Шніп, «Мастацкая літаратура, 390 с.



Унікальныя па сваёй ідэі выданні — Чырвоная кніга для дзяцей у вершах (2008, аўтар Віктар Гардзей), «эцюды» пра фаўну і флору (2008–2009, Алесь Бадак) — нядаўна займелі годны працяг — «Вершаваную энцыклапедыю жывёльнага свету». Яна распавядзе цікаўнаму маламу чытачу пра звяроў, птушак і рыб.

Усяго расказана пра паўтары сотні «братоў нашых меншых» — ад авечкі да яшчаркі. Ахоплены прадстаўнікі як «свойскага» асяродку, так і дзікага свету, у тым ліку экзатычнага.

Кожны артыкул мае наступную будову: ілюстрацыя, затым — празаічная інфармацыйная даведка (мовай спрошчанай, але не прымітызаванай!), дзе паведамляецца не толькі агульная характарыстыка «брата», але і — напрыканцы — яго прывязка да геаграфіі, перадусім Беларусі.

Урэшце — вершы. Самых розных беларускіх аўтараў. Галоўным крытэрыем для адбору, відавочна, стала якасць. Таму слабых твораў у выданні не знойдзеце. Як распавяла ўкладальніца, «у гэтай энцыклапедыі прадстаўлена толькі чацвёртая частка сабраных мной вершаў». А значыць, выбар быў добры. Дададмо, што вершы розныя па стылістыцы, і кожны знойдзе сабе твор па гусце і па настроі. Дзеля прыкладу — пару рознапланавых цытаванняў. Гуллівы верш Міколы Чарняўскага «Маржанятка-мурзанятка»:

Маржанятка-мурзанятка
Плюхалася ў моры.
Морж мачалкай маржанятка
Шараваў да зморы:
«Ох, нялёгкі ўсё ж занятак —
Мыць у моры маржанятак!

Такіх, канечне, большасць. Але страчаюцца і больш размераныя рытмы з «сур'ёзнымі» сюжэтамі:

Туман плыве з нізіны сівы
Над нівай голай і пустой.
«Глядзіце, заяц варыць піва», —
Жартуюць людзі між сабой.

У гэтых радках многія пазнаюць пачатак вядомага верша Уладзіміра Караткевіча «Заяц варыць піва», у якім за іроніяй прыхаваны і пэўны экзістэнцыяльны сум.

Акрамя таго, мастачка не абмежавалася адной ілюстрацыяй. Колькасць і вершаў, і малюнкаў узрастае па меры «папулярнасці», распаўсюджанасці ў нашым культурным і прыродным дыскурсе таго ці іншага прадстаўніка фаўны.

Кола аўтараў вельмі прадстаўнічае — ад класікаў (Максім Танк, Васіль Вітка, Сяргей Новік-Пяюн, Артур Вольскі, Ніл Гілевіч, Генадзь Бураўкін, Рыгор Барадулін) да нашых сучаснікаў — і вядомых, і яшчэ маладых (Леанід Дранько-Майсюк, Анатоль Зэкаў, Казімір Камейша, Алесь Каско, Пятро Васючэнка, Віктар Шніп, Уладзімір Марук, Алег Мінкін, Данута Бічэль, Васіль Зуёнак і многія іншыя).

Як слушна гаворыцца ў анатацыі, акрамя пазнавальнай функцыі, якую звычайна нясуць энцыклапедычныя выданні, гэта кніга выконвае яшчэ і эстэтычную, творчую, выхаваўчую, патрыятычную, экспрэсіяністычную і забаўляльную функцыі. Дадам, што многія вершы развіваюць пачуццё гумару.

Выданне выключнае і павінна быць у кожнага маленькага беларусіка!

Анатоль Трафімчык

Сіўчыкаў: кнігі — дзецям!

Сонейка. Хрэстаматыя дзецям дашкольнага ўзросту / уклад. Р. І. Шастак, «ІП Уладзімір Сіўчыкаў», 2013, 304 с.

Залатая яблынька. Казкі, легенды, паданні. Хрэстаматыя дзецям малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту / уклад. У. М. Сіўчыкаў, «ІП Уладзімір Сіўчыкаў», 2013, 288 с.

Новая серыя распачата вядомым выдаўцом Уладзімірам Сіўчыкавым. Выдадзены дзве кнігі-хрэстаматыі — «Сонейка» (дзецям дашкольнага ўзросту) і «Залатая яблынька» (дзецям малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту). Іх наклад — больш чым па 5 тысячаў асобнікаў — гаворыць сам за сябе і сведчыць пра перспектыўнасць і выдавецкай справы ў галіне дзіцячай літаратуры, і — апдаведна — самой айчыннай літаратуры. Тым больш што без даўно закрытага выдавецтва «Юнацтва» дзяржава не спраўляецца з аблугоўваннем попыту і пакідае пустыя нішы.

Калі другая з названых кніг разлічана на ўзроставую катэгорыю, якая мае даволі шырокі «асартымент» для чытання, дык адрасаваная дашкольнікам чытанка папоўніла не зусім густыя літаратурныя ўзыходы.

У «Сонейку» сабраныя творы не хаатычна. Найперш прыемна бачыць узроставую дыферэнцыяцыю: першая малодшая група (да трох гадоў), другая малодшая група (3-4 гады), старэйшая група (5-6 гадоў).

Аднак падзел трэба лічыць умоўным. Мала таго, што дзеці неаднолькавыя па ўспрыманні мастацтва (як і ўсе мы), дык і ступень разумення беларускай мовы будзе таксама рознай. А значыць, «Сонейка» стане вельмі дарэчным дапаможнікам пры засваенні мовы «з нуля». Прычым не толькі дзецьмі, але і іх дарослымі апекунамі.

Плённая праца ўкладальніка бачыцца і ў падборы жанраў і аўтараў. Ахоплены лепшыя творы ад фальклору і класікаў да сучаснікаў. Прычым шмат месца займае прадстаўніцтва рускай літаратуры (у чым бачыцца здаровае імкненне быць запатрабаваным на рынку). Галоўны крытэрый — высокі эстэтычны ўзровень твораў, сярод якіх: казкі, легенды, кароткія апавяданні, вершы, загадкі, скарагаворкі, лічылкі, гульні і шмат іншага мастацкага матэрыялу. Асобна адзначым, што кожнай узроставай групе прапануецца па драматургічным творы.

Калі «Сонейка» разлічана на чытанне дарослымі, то «Залатая яблынька» — дзецьмі. Чамусьці ў апошняй адсутнічаюць вершаваныя творы (за выключэннем «Ваўкалака» Янкі Купалы і «Быліны пра мураша Бадзіню» Максіма Танка). Гэтае выданне «спецыялізуецца» на казках, падзеленых на тры традыцыйныя раздзелы, легендах і паданнях. Тут і творы фальклорныя, апрацаваныя «служачымі пяра», і аўтарскія. Для патрыятычнага выхавання асабліва карысныя і пазнавальныя будуць легенды «Адкуль свет пайшоў» і «Адкуль пайшлі беларусы», паданні пра нашы рэкі і гарады. Паклапаціўся У. Сіўчыкаў і пра «даходлівасць» — склаў спіс патэнцыйна незразумелых для дзяцей слоў.

Абедзьве кнігі, прапануючы шырокі дыяпазон мастацкіх матэрыялаў, значна спрашчаюць іх пошук. Немалы наклад дае падставы думаць, што выданне дойдзе да зацікаўленых чытачоў. Галоўнае, каб супрацоўнікі адпаведных установ і бацькі дашкольнікаў не ленаваліся сачыць за такой літаратурай. Яе плыня, калі верыць тэндэнцыі, будзе пашырацца.



200-годдзе аўтара ўкраінскага гімна

Прэзідэнт Украіны Пётр Парашэнка даручыў ураду распрацаваць план святкавання 200-годдзя з дня нараджэння Міхаіла Вярбіцкага і 150-й гадавіны першага публічнага выканання нацыянальнага гімна «Ще не вмерла України і слава, і воля...».

У прыватнасці, Кабмін павінен прадугледзець арганізацыю ў абласных цэнтрах, іншых населеных пунктах, звязаных з жыццём і дзейнасцю М. Вярбіцкага, тэматычных культурных акцый з прыцягненнем шырокай аўдыторыі, у першую чаргу вучнёўскай і студэнцкай моладзі; правядзенне навукова-практычных канферэнцый, круглых сталоў, семінараў. Акрамя таго, урад павінен забяспечыць падрыхтоўку і выпуск юбілейнага друкаванага выдання пра гісторыю стварэння гімна Украіны, жыццёвага шляху яго аўтараў; выпуск нотных выданняў М. Вярбіцкага, а таксама яго музычнай спадчыны на кампакт-дысках.

Расійская кніга ва Украіне

Продаж расійскіх кніг ва Украіне рэзка ўпаў.

З-за байкоту расійскіх тавараў доля літаратуры, выпускаемай выдавецтвамі Расійскай Федэрацыі (не расійскамоўнай) на ўкраінскім рынку рэзка скарацілася. Так, калі раней расійскія выданні займалі каля 80% рынку, то ў 2014 годзе іх колькасць ледзь дацягвала да 50% аб'ёму ўсёй прадаванай прадукцыі.

Эксперты адзначаюць, што ў сакавіку 2015 года можна будзе гаварыць і аб больш істотным пераразмеркаванні кніжнага рынку Украіны. Цяпер жа, паводле справаздачы Мытнага камітэта Украіны, за 9 месяцаў 2014-га мяжу перасекла 1,4 млн. кілаграмаў кніг, тады як у 2012 і 2014 гадах аб'ём увозу складаў 3,9 млн і 3,3 млн кілаграмаў літаратуры адпаведна. Па падліках мытнікаў, дарэчы, 1 кг прыкладна роўны тром кнігам.

Цікава і тое, што «шэры» імпарт выдавецкай прадукцыі з Расіі, які складаў каля 40% аб'ёму выданняў, таксама скараціўся, — прыкладна ў два разы. Такім чынам у краіну ўвозіцца, як правіла, танная бульварная літаратура, а таксама палітычна арыентаваная белетрыстыка. Пакуль жа ў кнігарнях Украіны набыць расійскія кнігі — не праблема, аднак гэта таварныя рэштківа, а вось навінкі варта заказваць у электронным фармаце.

Мужчыны, жанчыны і кнігі

Пераважную большасць прадстаўнікоў моцнай паловы чалавецтва не цікавіць літаратура, напісаная аўтарамі жаночага полу.



Ангельскія сацыёлагі правялі маштабнае сацапытанне з мэтай высветліць, якія літаратурныя прыхільнасці маюць жыхары Вялікабрытаніі і як рэагуюць на кнігі аўтараў супрацьлеглага полу.

Даследаванне, удзельнікамі якога сталі больш за 40 тысячаў рэспандэнтаў, паказала, што як мужчыны, так і жанчыны сапраўды любяць чытаць: 80% апытаных прызналіся, што ўвесь час перачытваюць тыя ці іншыя кнігі. Але навукоўцы выявілі наступную заканамернасць: аказваецца, пераважная большасць прадстаўнікоў моцнай паловы чалавецтва не цікавіць літаратура, напісаная аўтарамі жаночага полу. 90% мужчын папросту не возьмуць такую кнігу ў рукі.

Акрамя таго, моцны пол пры выбары твора кіруецца жанрам і сюжэтам, не звяртаючы зусім ніякай увагі на дату яго напісання. Жанчыны ж аддаюць перавагу навінкам — кнігам-бэстсэлерам, якія ўзляцелі на пік папулярнасці. Не лішнім будзе згадаць, што і прадстаўніцы «слабага полу» ў большасці выпадкаў аддаюць перавагу літаратуры, напісанай жаночай рукой.

Падобнае даследаванне нядаўна правodзілі нямецкія навукоўцы. Вынікі іх апытання паказалі, што мужчыны чытаюць, імкнучыся атрымаць максімум важнай для іх інфармацыі. Жанчыны ж захапляюцца чытаннем, каб атрымаць эмоцыі.

125-годдзе Барыса Пастэрнака

...Да 1917 года ён кідаўся паміж дэкадэнцкай эстэтыкай свайго музычнага настаўніка Скрабіна і строгасцю філасофіі неакантыянства, успрынятай ім у гады навучання ў Марбургу.



У выніку давялося перамагчы і першае, і другое дзеля таго, каб паглыбіцца ў хаос уласных метафар ды інтанацый, ператвараючы яго ў асэнсаванае духоўна.

Рэвалюцыя і Грамадзянская вайна пераканалі Б. Пастэрнака ў тым, што прыгажосць далёка не заўсёды здольная ратаваць свет і што трэба набрацца цярпення, каб захаваць яе ў сабе.

Дваццатыя і трыццатыя гады ён напоўніў такой паэтычнай любоўю, што часам здаецца, быццам бы голад, калектывізацыя, індустрыялізацыя, рэпрэсіі адбываліся ў іншай краіне. Аднак рамантыка яго вершаваных цыклаў таго часу падмацаваная яскравымі рысамі эпохі настолькі, што хочацца вывучаць гэты перыяд па Пастэрнакаўскай лірыцы, а не па сумных і часта тэндэнцыйных падручніках.

У час вайны Б. Пастэрнак духоўна зліўся з народам і паклаў на алтар агульнай перамогі столькі, колькі мог.

У другой палове саракавых ён прыступіў да вельмі рызыкоўнай для прызнанага паэта задумы — вялікага эпічнага рамана. Прыступіў з усёй уласцівай яго дару сур'ёзнасцю і засяроджанасцю. У выніку выпакутаваны тэкст, яшчэ не апублікаваны, трапіў у жахлівую перапрацоўку, справакаваную асяроддзем паэта і нядбайнымі чыноўнікамі ад культуры часоў Хрушчова.

Але паэт быў вышэй нявартай валтузні. У яго жыцці і смерці, як і ў яго вершах, ідэальна спалучаюцца форма і змест.

Без Барыса Пастэрнака літаратурная карта свету пазбаўляецца цэлай краіны. Так і Масква без помніка яму часам выглядае занадта сіратлівай. Шкада, што яго памяць не ўвекавечана гэтак жа, як памяць іншых рускіх нобелеўскіх лаўрэатаў: Буніна, Шолахава, Бродскага...

ПРЭМІІ

Прэмія імя Шаўчэнкі

Паводле інфармацыі, якая паступіла з Шаўчэнкаўскага камітэта, лаўрэатамі Нацыянальнай прэміі Украіны імя Тараса Шаўчэнкі сталі Юрый Бурак (за кнігу вершаў «Не мёртвае мора») і Косць Маскалец (за кнігу эсэ «Бліскавіцы»).



Прэмія «Нового мира»

У Культурным цэнтры Фонда «Новы свет» адбылося ўручэнне прэмій аднайменнага часопіса і прэміі «Antologia» за 2014 год.

У гэтым годзе адно з найстарэйшых расійскамоўных штомесячных літаратурна-мастацкіх выданняў — часопіс «Новый мир» — адзначае сваё 90-годдзе. У розныя гады яго аўтарамі былі пісьменнікі, паэты, філосафы Уладзімір Дудзінцаў, Ілля Эрэнбург, Чынгіз Айтматаў, Васіль Быкаў, Віктар Астаф'еў, Іосіф Бродскі і многія іншыя.

Рэдакцыя «Нового мира» адзначыла прэміямі Паўла Нерлера — за артыкул «У адзінаццатым бараку. Апошнія адзінаццаць тыдняў Восіпа Мандэльштама», Мікалая Багамолава — за артыкул «Два савецкія Лермантавы», Алега Ермакова — за вандроўную кнігу «Вакол свету» і аповесць «Чаканшчык»; Аляксея Пурына — за паэтычную падборку «Лаўр і базілік».

Лаўрэатамі прэміі «Antologia» па выніках 2014 сталі Уладзімір Леановіч (1933–2014) за кнігу «Драўляная грамата»; Віталій Пуханаў за кнігу «Школа міласэрнасці»; Ната Сучкова за кнігу «Ход рэчаў». Адмысловымі дыпломамі прэміі ўзнагароджаны Алена Сунцова і Валерый Шубінскі.

Барак Абама і кнігагандляры

Барак Абама падтрымаў незалежных кнігагандляроў.

У Дзень падтрымкі малога бізнэсу, які прайшоў у ЗША, прэзідэнт краіны выступіў з прамовай перад незалежнымі кнігагандлярамі і ў суправаджэнні дачок Маліі і Сашы наведаў «Politics & Prose» ў Вашынгтоне.

Пра візіт прэзідэнта загадзя нічога не было вядома, таму пакупнікі і ўладальнікі крамы былі шчыра здзіўлены праяўленай увазе і за 25 хвілінаў (менавіта столькі доўжыўся візіт прэзідэнта) паспелі задаць мноства цікавых пытанняў.

Зрэшты, зусім выпадковым візіт не назавеш: у мінулым годзе пасля Дня падзякі Абама таксама заходзіў у «Politics & Prose». Новая акцыя была закліканая прыцягнуць увагу грамадскасці да малога бізнэсу ЗША, а таксама павысіць продаж кніжнай прадукцыі ў незалежных кнігарнях.

Без пакупак Абама не пайшоў — у кнігарні ён выбраў 17 кніг.

Беларускім «Логвінавым» ды іншым незалежным кнігагандлярам застаецца толькі марыць аб падобным нават і не марыцца...

Старонка падрыхтавана паводле матэрыялаў The Bookseller, BBC, РИА Новости, The Guardian, Associated Press, vsiknygy.net, prostoknіga.com.ua, novostiliteratury.ru, Gazeta.ua, lgz.ru і Newsru.ua.

Літаратурная Беларусь
Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА.
Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91. Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by